PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://republika.pl/niva_bielastok/
niva_bielastok@poczta.onet.pl
niva_bielastok@skrzynka.pl

№ 47 (2428) Год XLVII | Беласток, 24 лістапада 2002 г. | Цана 2,00 зл.

Беларуска-расійская эканамічная вайна

Яўген Мірановіч

Ад часу славутай сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі і Уладзіміра Пуціна ў Маскве, калі гаспадар Крамля запрапанаваў уключыць Беларусь у склад Расійскай Федэрацыі, мінула амаль тры месяцы. У Еўропе, а нават у Польшчы прапанову Пуціна прынялі з вялікім зразуменнем, так як і амерыканскія планы зраўняць з зямлёю чарговую краіну, гэтым разам Ірак. У Беларусі перспектыва ліквідацыі дзяржавы таксама не выклікала вялікіх эмоцый. Частка грамадзян — не толькі расіян — выразна адабрае такі план. Яны звычайна марылі стаць сапраўднымі рускімі, так сама як беластоцкія праваслаўныя мараць, каб урэшце стаць сапраўднымі палякамі. Разбітай апазіцыі не было пад сілу нават правесці акцыю пратэсту супраць наяўных планаў інкарпарацыі краіны. Толькі прэзідэнт Лукашэнка, выкарыстоўваючы сродкі масавай інфармацыі, пачаў дзейнічаць супраць планаў захопу Беларусі.

Лукашэнка, які доўгімі гадамі быў галоўным прапагандыстам яднання Беларусі і Расіі, праўдападобна ў канцы зразумеў, што на вялікай прасторы расійскіх уплываў з'яўляецца не суб'ектам, а толькі прадметам палітыкі, і што вышэй пасады прэзідэнта Беларусі няма чаго яму шукаць. А калі б не стала Беларусі, трэба было б пакорліва ісці прасіць ласкі ў гаспадароў Крамля. Раней, як пісала расійская прэса, бачыў ён сябе ў Маскве, у ролі віцэ-прэзідэнта Саюза Беларусі і Расіі. Цяпер лёс Лукашэнкі цалкам залежны ад існавання беларускай дзяржаўнасці. Таму не па патрыятычных, а чыста асабістых прычынах стаў ён абараняць суверэнітэт краіны і называць Пуціна палітыкам горшым за Сталіна.

Апошнім часам відаць, што прапагандысцкая вайна перайшла ў стадыю эканамічнай. Расіяне запатрабавалі ад Беларусі плаціць за газ, нафту і электраэнергію такую самую цану, якую плацяць іншыя пакупнікі гэтых прадуктаў. На практыцы абазначала б гэта дзяржаве павелічэнне цэн амаль у два разы, а грамадзянам Беларусі — значна больш. Лукашэнка са свайго боку зрабіў тое, што павінен зрабіць восем гадоў таму. Загадаў Маскве плаціць сапраўдныя цэны за транзітныя паслугі і мытную ахову заходняй мяжы. Рыначныя цэны за энерганосьбіты маглі б адмяніць сітуацыю ў Беларусі. Улады напэўна ведаюць, што сацыялістычнае грамадства не стрымае капіталістычных цэн, таму цалкам апраўданымі сталі пошукі новых крыніц для бюджэту.

Вынік эканамічнай вайны мог бы прывесці да нармалізацыі адносін па-

[працяг ☞ 2]

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Удзельнікі VII Агульнапольскага конкурсу беларускай паэзіі і прозы

У пошуках таленту

— Няма слоў, няма думак — цытатай з верша ўдзельніцы падвёў вынікі доктар Янка Трацяк, член камісіі VII Агульнапольскага конкурсу беларускай паэзіі і прозы. Адзначыў ён:

— Нашым аўтарам не хапае літаратурнай падпіткі. Няма ў іх начытанасці ў беларускай літаратуры. Чалавек перастае думаць, калі перастае чытаць.

Адсутнасць (беларускіх) слоў сталася нормай сярод вучняў пачатковых школ, большасць іх размаўляе ўжо папольску. Чытанне літаратуры на беларускай мове часта абмяжоўваецца да школьных падручнікаў.

* * *

Урачыстае падсумаванне конкурсу адбылося 9 лістапада г.г. у Беластоку. Прыняло ў ім удзел каля трыццаці аматараў беларускай паэзіі і прозы. Камісія ў саставе: Надзея Артымовіч — старшыня, Ежы Плютовіч і Янка Трацяк — члены, ужо другі год запар не прызналі месцаў. Сярод вылучаных аўтараў, у групе пачатковых школ і гімназій апынуліся: Мартына Ева Леанеўская („Сончык") з Лясное каля Нараўкі, Радзік Маціевіч („Маленькі") з Беластока, Паўліна Нічыпарук („Нясмелая") са Скупава і Эвеліна Бурнос („Пчолка") з Рыбалаў.

Як сказаў д-р Я. Трацяк, найцікавей праявілі сябе наймалодшыя ўдзельнікі конкурсу. У іх паэтычнай фразе адчуваецца шчырасць і прастата, складная кампазіцыя.

У першай групе праявіліся адзінаццаць аўтараў, з якіх аж шасцёра былі дэбютантамі.

— Мой поспех гэта мая і маёй настаўніцы заслуга, — сказала Паўліна Нічыпарук са Скупава.

Пра дапамогу гавораць усе пачаткоўцы, на іх поспех заслужылі настаўнікі, бацькі, бабулі ці сваякі. Ідзе тут пра падтрымку таленту і роднай мовы.

Сярод дарослых удзельнікаў конкурсу камісія вылучыла Пятра Акуліка з Ваўкавыска, Магдаліну Леанчук і Наталлю Зофію Лемеш з Гайнаўкі. Першы аўтар звярнуў увагу прозай-абразкамі ў стылі жартаў, у нечым падобную на творчасць Янкі Брыля.

Зося Лемеш — адкрыццё „Нівы" — задуменна і лірычна напісала пра пошукі Бога на небе і „ў зямлі", а паэтка Магдаліна Леанчук знайшла словы і думкі, якіх не хапала многім канкурсантам.

Разам з дарослымі д-р Янка Трацяк памясціў 10-гадовую „Татарку". Яе апавяданне ў стылі абразкоў „Як рыцар Точак выратаваў Брыгіду" паказалася цікавым і добра скампанаваным, хаця зашыфраваным і да канца незразумелым!

Сам конкурс, нягледзячы на словы крытыкі, праходзіць у новую якасць. Найбольшае зацікаўленне праяўляе школьная моладзь, ліцэісты, студэнты. У многіх назіраецца захапленне і зачараванне беларускай мовай. Клімат вакол конкурсу элітарны — тым больш, што ў якасці ўзнагарод арганізатары (Беларускі Саюз у РП і „Ніва") прыдбалі вартасныя кніжкі.

Марыя Манаховіч і Вольга Анацік, народныя паэткі з Аўгустова, удзельніцы ад першага выпуску конкурсу. Сустрэча з аматарамі беларускай паэзіі і прозы для іх — свята. Наогул, калі гаварыць пра атмасферу мерапрыемства, адчувалася тут сямейнасць і добразычлівасць.

— Мы рады, што так многа моладзі цікавіцца беларускай мовай, — сказала Марыя Манаховіч.

Ганна Кандрацюк

PS. Лепшыя працы будуць апублікаваны. Першую падборку друкуем на 5 старонцы.

Апасаюцца таннага збожжа ☞ 3

У краінах Еўрасаюза вядзецца інтэрвенцыйная скупка збожжа па ўстойлівай цане (101 еўра за тону). Калі ўвесці яе ў нас, будзе гэта карысным для вытворцаў жыта, але некарысным для вытворцаў пшаніцы. Напрыклад, у Францыі земляроб атрымае 340 еўра даплаты да кожнага гектара абсеянага збожжам, а ў Польшчы толькі 45 еўра.

Еўропа меншасцям — меншасці Еўропе ☞ 4

У канферэнцыі „Еўропа меншасцям — меншасці Еўропе", арганізаванай у Гайнаўцы з 8 па 10 лістапада Беларускім аб'яднаннем студэнтаў, прынялі ўдзел прадстаўнікі беларускіх, украінскіх, лэмкаўскіх і яўрэйскіх маладзёжных арганізацый. У час мерапрыемства моладзь знаёмілася з еўрапейскімі ўстановамі, якія падтрымоўваюць дзейнасць нацыянальных меншасцей.

Я — празаічная дзяўчына ☞ 5

Зося Лемеш — лаўрэатка VII Конкурсу беларускай паэзіі і прозы: „Мой поспех у літаратурным конкурсе гэта справа шчасця; я нават не здзіўляюся, я маю шчасце ў жыцці. Кожны дзень пішу нешта на беларускай мове. Мне падабаецца працаваць і думаць так, як падказвае мая інтуіцыя".

Петрукова Падляшша ☞ 8

Уладзіслаў Петрук працягвае сваю руплівую працу па дакументаванні пёркам на паперы нашага краявіду і культуры. Яго рэтраспектыўную выставу можна глядзець у Малой галерэі Беластоцкага асяродка культуры, у фае кінатэатра „Форум".

Каля іконы велікамучаніка Дзімітрыя ☞ 9

У Мужчынскім манастыры святога велікамучаніка Дзімітрыя Салунскага, які існуе ў Саках ужо звыш года, пабольшала апошнім часам колькасць браціі. Апрача ігумена Варсанофія і іераманаха Пятра, якія былі ад пачатку, жывуць у ім іерадыякан Тамаш і брат Марк. Зараз у былым школьным будынку вядуцца рамонтныя работы.

(Не)жаданыя дзеці ☞ 10

Першай дзяўчынцы з прабіркі зрабілі тады шмат здымкаў. Сёння ў архівах газет, якія пісалі пра справу, не знайсці тых фатаграфій. Маці дзяўчынкі паявілася ў клініцы праф. Шаматовіча, калі дзяўчынка пайшла ў школу. Пасля замоўкла. Жыве з дачкой у адной з падляшскіх мясцовасцей, не хоча сустэрч з журналістамі, здымкаў, папулярнасці.

Беларусь — беларусы

Справа — труба

Акурат напярэдадні зімы паміж Расіяй і Беларуссю разгарэўся газавы скандал. Нягледзячы на тое, што такія падзеі беларуская краіна перажывае ўпершыню за ўвесь час свайго незалежнага існавання, падмуркам іх стала працяглае нежаданне жыць па сродках, што было адной з асноўных спасылак у дачыненнях урада Лукашэнкі з суседняй краінай.

Напрыканцы кастрычніка расійскае акцыянернае таварыства „Газпрам", якое фактычна з'яўляецца манапалістам у здабыцці і продажы газу, заявіла аб неабходнасці скараціць напалову адбор газу беларускім прадпрыемствам „Белтрансгаз". Калі перакласці гэта на звычайную мову, то атрымаецца, што беларускія спажыўцы мусяць карыстацца газам у колькасці, якая ў два разы меншая за папярэднюю. Тлумачэннем такіх дзеянняў са свайго боку „Газпрам" называе вычарпанасць акрэсленага адпаведнай дамовай аб'ёму газу „Белтрансгазам" 10,2 мільярдаў кубаметраў за вызначаную суму па 24 долары за кубаметр.

Такая пастаноўка пытання выклікала сапраўдны перапалох у беларускага ўрада, бо такімі справамі, пры адміністрацыйна-камандным кіраванні эканомікай, займаецца менавіта ён. „Белтрансгаз" — дзяржаўнае прадпрыемства і не можа па ўласнай ініцыятыве вызначаць, па якіх коштах і дзе набываць гэты самы газ.

Да выказванняў з такой нагоды спрычынілася не толькі беларускае Міністэрства замежных спраў, якое назвала такія дзеянні з боку „Газпрама" палітычным ціскам на Беларусь, але і сам Аляксандр Лукашэнка. У сваёй эмацыянальнай манеры беларускі лідэр пачаў пагражаць Расіі спагнаннем па сусветных коштах грошай за мытню, транспарціроўку і ўсім іншым, чым „саюзніцкая" краіна карыстаецца згодна раней дамоўленых цэн. Пры ўсім гэтым, А. Лукашэнка тлумачыць з чаго раптам узніклі такія патрабаванні ад расіян. Апошнія, маўляў, хочуць прыдбаць гэты самы „Белтрансгаз", шляхам удзелу ў прыватызацыі апошняга.

Вось тут, як гаворыцца, і зарыты сабака. Яшчэ з часоў леташніх прэзідэнцкіх выбараў кажуць, што адной з умоў падтрымкі А. Лукашэнкі з боку Расіі была ягоная згода на прыватызацыю расійскім капіталам беларускіх дзяржаўных прадпрыемстваў. Варта адзначыць, што пад гучныя заклікі да інтэграцыі і мацавання славянскага братэрства расійскія бізнесмены спрабавалі пашырыць свой уплыў на саюзніцкую Беларусь. Па вялікаму рахунку, асаблівых дасягненняў у гэтай справе ім зрабіць не ўдалося. Прычына ўсё тая ж — чым больш суб'ектаў гаспадарання ў прыватных руках (нацыянальная прыналежнасць тут ролі не грае), тым праблематычней кіраваць эканомікай, седзячы ў чыноўніцкім фатэлі, бо гаспадар прыватнай фірмы, аказваецца, сам лепей ведае каму, куды і колькі чаго вырабіць і рэалізаваць.

Палітыка, як вядома, гэта канцэнтраваная эканоміка і нарэшце надышоў час плаціць па выстаўленых рахунках, пра што сведчаць і словы беларускага прэзідэнта: «В последнее время давление на Беларусь осуществляется неимоверное, в том числе и на меня: если не отдашь в собственность, разговор будет иной. И потребовали немедленно приватизировать „Белтрансгаз" и акции передать „Газпрому"».

Беларускае кіраўніцтва адразу пачало лічыць, хто каму больш вінны. Але дакладна вызначыць гэта наўрад ці магчыма, бо падчас моцных мужчынскіх пацалункаў і клятваў у спрадвечнай дружбе, такая бухгалтэрыя вялася зусім нядбайна. І гэта зразумела — тады не было ў ёй патрэбы.

Адчуваецца, што расіяне, як ужо не аднойчы было ў іх гісторыі, узялі сабе ў саюзнікі зіму. Перад наступленнем халадоў беларускі ўрад спасаваў — апошні візіт прэм'ера Навіцкага ў Маскву меў вынікам згоду на выплату Беларусі 80 млн. долараў запазыкі і зняццё ўсіх абмежаванняў акцыянавання „Белтрансгаза". „Газпрам" пры гэтым згадзіўся павялічыць аб'ём газу для Беларусі на 25% да ранейшых 50% ад першапачатковага.

Зразумела, ставіць кропку ў гэтай гісторыі яшчэ заўчасна. І аб тым, што газавы канфлікт не вычарпаны, адчуюць у першую чаргу тыя, дзеля якіх нібыта існуе і ўрад, і прэзідэнт — звычайныя людзі, кватэры якіх узімку будуць мець ледзьве цёплыя батарэі і гарачая вада з водаправодных кранаў толькі нязначна будзе адрозніваццa ад халоднай.

Уладзімір Лапцэвіч

Хто яны — людзі ў масках?

12 лістапада ў Гродне адбылася незвычайная прэс-канферэнцыя — на пытанні прысутных журналістаў адказвалі людзі ў чорных масках — таксама журналісты, якія штодня аднаўляюць сайт забароненай год таму незалежнай газеты „Пагоня" (http://pahonia.promedia.by)

Прэс-канферэнцыю вёў адпушчаны на пабыўку ў Гродна „за добрыя паводзіны ў месцы адбыцця пакарання" рэдактар Мікола Маркевіч. Ён яшчэ раз распавёў калегам гісторыю закрыцця „Пагоні" і зазначыў, што пераслед супрацоўнікаў забароненай незалежнай газеты працягваецца.

Сапраўды, 24 кастрычніка ў Ленінскі райаддзел міліцыі Гродна была выклікана карэспандэнтка „Беларускай газеты" Ірына Чарняўка, якая апошнім часам супрацоўнічала і з „Пагоняй". Следчыя ёй растлумачылі, што на патрабаванне мясцовай пракуратуры яны мусяць высветліць, хто канкрэтна распаўсюджвае забароненую газету ў электронным выглядзе. Ірыне Чарняўцы таксама паказалі спіс з імёнамі і дакладнымі адрасамі і тэлефонамі яшчэ шасцярых журналістаў, якія нібыта падпольна аднаўляюць сайт „Пагоні". Ірына Чарняўка падпісала паперу, што не мае ніякага дачынення да вышэйзгаданага сайту.

Натуральна, у прысутных на прэс-канферэнцыі журналістаў узнікла пытанне: „Якім чынам тады існуе сайт цэлы год пасля закрыцця газеты?" Рэдактар Мікола Маркевіч адказаў:

— Каб не падтрымка калег з іншых незалежных выданняў, існаванне сайту „Пагоні" ў сённяшніх нялюдскіх умовах было б немагчымым. Я цешуся, што ёсць яшчэ людзі, здольныя абараніць свабоду слова. Таму ў тых, хто імкнецца заткнуць нам рот, у гэтых аматараў „трымаць і не пушчаць", спадзяюся, будзе вельмі кароткае жыццё!

Ігар Гандлеўскі

Беларуска-расійская эканамічная вайна

[1 ☞ працяг]

між дзвюма краінамі. Рынкавыя цэны далі б Беларусі магчымасць выбару пастаўшчыкоў сыравіны, але за гэтым ішла б палітычная незалежнасць. Мала праўдападобна, аднак, што расіяне добраахвотна маглі б адмовіцца ад свае дамінацыі ў Беларусі. З другога боку Беларусь, якая раней вяла аднавектарную, прарасійскую палітыку, апынулася ў тупіку. Прэзідэнт будаваў саюз з Расіяй пад лозунгам супрацьстаяння амерыканскаму імперыялізму. Расіяне тым часам сталі — яшчэ невядома — саюзнікамі, ці васаламі, амерыканцаў, аднак ніхто ў свеце не будзе ім перашкаджаць у гульнях з Лукашэнкам. Магчыма памяняюць яны яго на апазіцыйнага палітыка, якога здаўна рыхтуюць да ролі новага бацькі беларускага народа. Кадэбісты, якія цяпер кіруюць Расіяй, маюць у такіх гульнях вялікі вопыт.

Найбольш цікавай справай у дачыненні да апошніх падзей у Беларусі з'яўляецца адсутнасць якіх-небудзь звестак пра гэта ў польскіх сродках масавай інфармацыі. Журналісты, якія шырока і падрабязна пішуць, напрыклад, пра новы закон аб дзяржаўнай рэлігіі Беларусі, зусім не цікавяцца існаваннем гэтай дзяржавы. У Польшчы як бы ўсе змірыліся з міфам, што Беларусь з'яўляецца часткай Расіі. Далей, на захад ад Польшчы, мала хто ведае, дзе знаходзіцца Беларусь.

Яўген Мірановіч

Беларусь: Прафесар Калодка аб глабалізацыі

Віцэ-прэм'ер, міністр фінансаў Польшчы Гжэгаж Калодка прэзентаваў у Мінску беларускае выданне сваёй кніжкі „Глабалізацыя і перспектывы развіцця постсацыялістычных краін".

Перакладзеная на рускую мову і выдадзеная тыражом у 1 000 экземпляраў кніжка прафесара Калодкі выйшла дзякуючы недзяржаўнаму Мінскаму Еўрапейскаму гуманітарнаму універсітэту.

Прафесар Калодка прачытаў у гэтай прэстыжнай вышэйшай навучальнай установе даклад на тэму глабалізацыі і перспектыў развіцця постсацыялістычных краін. Віцэ-прэм'ер сказаў, што яго візіт у Беларусь мае прыватны характар і таму ён не сустрэўся з беларускімі палітыкамі дзеля правядзення афіцыйных перамоў. Папрасіў ён таксама, каб у час знаходжання ў Мінску называць яго „прафесарам". Для падкрэслення прыватнага характару візіту Гжэгаж Калодка прыехаў у Беларусь на агульнаграмадзянскім пашпарце, а не на дыпламатычным.

www.onet.pl

Бруна Шульц у Сярэднеўсходняй Еўропе

18 кастрычніка ў рамках сімпозіума „Прысутнасць Бруна Шульца ў Сярэднеўсходняй Еўропе" ў варшаўскай галерэі „Захэнта" адбылася прэзентацыя кнігі „Рэгіёны вялікай ерасі і ваколіцы. Бруна Шульц і яго міфалогія" аўтарства вядомага літаратуразнаўцы і паэта Ежы Фіцоўскага. Наступнага дня ў Клубе кнігара (што на Рынку Старога Места) прайшлі літаратурныя чытанні, прысвечаныя жыццю і мастацкай спадчыне Бруна Шульца, у якіх прынялі ўдзел знаўцы, перакладчыкі і проста прыхільнікі творчасці гэтага незвычайнага пісьменніка. Выступілі такія вядомыя „шульцазнаўцы", як, напрыклад, прафесар Ежы Яжэмбскі з Кракава, госці з Расіі, Нямеччыны, Сербіі, Украіны. Беласток прадстаўляў паэт і перакладчык Ежы Плютовіч, а Беларусь — паэты Ігар Бабкоў і Юры Гумянюк. Арганізавала сімпозіум фундацыя Пагранічча разам з Асяродкам „Пагранічча мастацтваў, культур, народаў" на чале з Кшыштафам Чыжэўскім.

Юры Гумянюк

Замалёўкі з падарожжа

Перад сёмай гадзінай у Беласток я прыехаў. Аформіўшы справу, рашыў вяртацца дамоў у 8[40]. У гэты час павінен быў ехаць рэйкавы аўтобус, але на Усіх святых адмянілі. Падставілі чатыры двухпавярховыя вагоны. Незадоўга да ад'езду цягніка ў вагон зайшоў элеганцік пад вусікам. Калі паглядзеў я з-пад акуляраў на спадарожніка, пазнаў жончынага кума, Янку з Дубяжына.

— Не пазнаеш сваяка?

— Чаму ж бы меў не пазнаць, — ціхенька адказаў прыяцель. — Пазнаў...

— Дзе пражываеш? — змяніўшы тэму, пытаю калегу.

— У Бельску... У Беласток „Пагодай" прыехаў, каб справы аформіць.

— Па раскладзе аўтобусы прыватніка ездзяць?

— Рэгулярна. Многія чыгуначнікі гэтай лініяй карыстаюцца. Ці машыністу аплаціцца за 5 зл. чакаць цягніка да 20[51], калі аўтобусам за 50 мінут у Бельску будзе?

— У Дубяжын заглядаеш?

— Летам з жонкай за гароднінай ездзім. Свая, усё ж-такі. Купляць не трэба. Бацькі памерлі. Дом пустуе.

— Дык прадай гаспадарку.

— Можа спатрэбіцца. Паўтысячы за кватэру плачу. Хто ведае, як далей будзе.

Янка, як і я, раздзяляе долю чыгуначнага пенсіянера. Зарплата невялікая. Жыць трэба ды і дзецям нейкі грош падкінуць належыцца.

— Добра што аўтобус адмянілі, — паясняе калега. — Усе не памясціліся б у двух вагончыках. Ды што гэта за падарожжа, калі нужніка ў вагоне няма. Ехаў я такім нядаўна ў Бельск. Старэчы захацелася пайсці за сваёй патрэбай.

— І што? — цікаўлюся.

— У Страблі на старэчу сем мінут чакалі, на станцыю ў туалет схадзіў. Цягнік спазнілі. А жонка гаварыла, што як ехала рэйкавым аўтобусам у Дубяжын, дык чула, што кандуктар раіў жанчыне падгузак з сабою вазіць. На такіх бы тэлевізію паслаць. Яна хутка справіцца, — закончыў кум, збіраючыся да выхаду ў Бельску-Падляшскім.

Калі я астаўся адзін і пачаў гартаць „Ніву", дык кандуктар прысеўся. На ягоным твары я прыкмеціў стомленасць.

— Нашлопаўся? — пытаю калегу, з якім даўней у Чаромсе працавалі.

— Не гавары. Ногі ў задніцу паўрасталі. Добра, што гэтыя два вагоны былі.

— А чаму яны недагрэтыя?

— У Чаромху для тэхнічнага агляду накіравалі, як у станцыю прыпіскі. Рэвідэнта выклікаў, каб гэты праход зрабіў, бо пляцоўкі паміж вагонамі былі падняты.

Калі міналі Падбелле, дык чамусьці праз акно паглядзеў я на раскінутую вёску Дубяжын. І сэрца зашчымела. Там на ўзгорку, пад раскідзістымі соснамі на могільніку жончыны бацькі і дачка наша пахаваныя. Многія на магілкі кветкі сёння нясуць. Але ў Дубяжыне па традыцыі на першы дзень Вялікадня ходзяць на магілы. На Усіх святых швагер адно лямпачкі запальвае. Так штогод робіць.

Уладзімір Сідарук

Без неспадзяванак

Першая сесія Рады Гайнаўскага павета не выклікала зацікаўлення жыхароў Гайнаўшчыны. Апрача радных, абслуговага адміністрацыйнага персаналу і нешматлікіх журналістаў прыйшоў на сесію толькі адзін звычайны выбаршчык. У выбарах перамог Кааліцыйны выбарчы камітэт СЛД-УП, які ўвёў у 17-асабовую раду 10 радных.

У выніку паўтарыгадзіннага пасяджэння былі раздзелены найважнейшыя пасады ў самаўрадзе Гайнаўскага павета. Старшынёю рады быў абраны Мікола Міхалюк з СЛД-УП, які ад верасня гэтага года з'яўляецца пенсіянерам. Раней працаваў дырэктарам Падставовай школы ў Чаромсе. Яго намеснікамі сталі Мікола Яноўскі з Беларуска-народнага выбарчага камітэта, які кіруе Гайнаўскім аддзяленнем Агенцтва мадэрнізацыі і рэструктурызацыі сельскай гаспадаркі і заадно гаспадарыць на 50 гектарах зямлі ў Пераходах, і Стэфан Кучынскі з СЛД-УП, які працуе лекарам у Нарве. Старастам паўторна абралі Уладзіміра Пятрочука з СЛД-УП.

Клубы радных СЛД-УП і БНВК падпісалі паразуменне аб супрацоўніцтве ў самаўрадах Гайнаўскага павета і горада Гайнаўкі. Старшыня Клуба павятовых радных БНВК Славамір Кулік заявіў, што паразуменне з'яўляецца прадаўжэннем супрацоўніцтва паміж згаданымі клубамі, якое рэалізавалася ў мінулым скліканні. Лічыць ён, што паразуменне ўзмоцніць працу Рады павета.

Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Жывёлаводы Гайнаўшчыны на сустрэчы прысвечанай сістэме IACS

Апасаюцца таннага збожжа

У палове кастрычніка Дарадчым сельскагаспадарчым асяродкам у Гайнаўцы была арганізавана сустрэча жывёлаводаў на тэму ўкаранення Сістэмы ідэнтыфікацыі і рэгістрацыі жывёлы (IACS) і даплат да вырошчвання збожжа пасля далучэння Польшчы да Еўрасаюза.

Вядучая спатканне Зузанна Мысткоўска з Падляшскага ваяводскага дарадчага сельскагаспадарчага асяродка ў Шапятове заявіла, што для ўсяго быдла ў Польшчы з лістапада гэтага года па люты наступнага будуць прычэплены завушніцы з кодамі, а жывёлаводы атрымаюць індывідуальныя пашпарты жывёлы. На працягу сямі дзён ад нараджэння цяляці трэба будзе павесіць завушніцы і выпісаць пашпарт. Будзе ён перадавацца ў выпадку продажу быдла новым уладальнікам. Сяляне будуць весці рэгістрацыю статка. Кожны кавалак мяса ў магазіне будзе памечаны кодам, на падставе якога можна будзе дайсці да апошняга ўласніка каровы, а па пашпарце даведацца, у якіх гаспадароў карова знаходзілася. Авечкі і козы будуць памечаны нумарам статка.

Уся жывёла будзе занесена ў Сістэму ідэнтыфікацыі і рэгістрацыі. У Гайнаўскім павеце за такой сістэмай будзе наглядаць Павятовае бюро Агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі, заснаванае ў верасні гэтага года. Гайнаўскім бюро кіруе Мікола Яноўскі. Працуе ў ім некалькі асоб, а будзе некалькі дзесяткаў чалавек. У інтэграванай сістэме ўпраўлення і кантролю гайнаўскага бюро будзе весціся рэгістрацыя пасеянага збожжа. Прадбачваецца, што бюро будзе займацца дафінансаваннем сельскай гаспадаркі з бюджэту Еўрасаюза.

У краінах Еўрасаюза вядзецца інтэрвенцыйная скупка збожжа па ўстойлівай цане (101 еўра за тону). Калі ўвесці яе ў нас, будзе гэта карысным для вытворцаў жыта, але некарысным для вытворцаў пшаніцы. У першыя гады пасля далучэння Польшчы да Еўрасаюза нашым гаспадарам прапануюцца даплаты да тоны збожжа ў памеры 25% даплат у Еўрасаюзе (даплачваюць там па 63 еўра да тоны) і з часам будуць яны расці. Аднак на практыцы даплаты могуць аказацца вельмі нізкімі, бо залежаць не ад сапраўднай прадукцыі, але ад сярэдняга плёну ў краіне. Напрыклад, у Францыі прынята сярэдні плён лічыць у памеры 5,5 тоны збожжа з гектара, а для Польшчы прапануецца на ўзроўні 2,9 тоны. У Францыі земляроб атрымае 340 еўра даплаты да кожнага гектара абсеянага збожжам, а ў Польшчы толькі 45 еўра. Сяляне, якія ў Польшчы займаюцца вырошчваннем збожжа апасаюцца канкурэнцыі заходніх раслінаводаў і завозу таннага збожжа. Гэта можа стаць прычынай нерэнтабельнасці сельгаспрадукцыі ў Польшчы.

Аляксей Мароз

Арлянскія аспекты

За час свайго існавання Арлянская гміна шматразова змяняла свае межы і адміністрацыйнае падпарадкаванне; у 1921 годзе апынулася ў межах Бельскага павета. Гміна, распаложаная ў басейнах рэк Арлянка, Белая і Нурэц, займае плошчу 15 982 гектары. У складзе гміны 22 салэцтвы: Чахі-Забалотныя, Дыдулі, Градалі, Рыгораўцы, Кашалі, Кошкі, Крывятычы, Маліннікі, Міклашы, Москаўцы, Алекшы, Орля, Пашкоўшчына, Паўлінова, Рудуты, Спічкі, Шчыты-Дзенцялова, Шчыты-Навадворы, Шарні, Тапчыкалы, Вулька і Вулька-Выгаеўская. У гміне, на дзень 30 чэрвеня г.г., пражывала 3 760 асоб. Гміна мае вясковы характар, добрыя глебавыя ўмовы; тут многа зямлі для продажу, а цана яе ніжэйшая чым у іншых гмінах Бельскага павета. У гміне найлепшая вада ў цэлым раёне, усе вёскі маюць водаправоды, для якіх ваду дастаецца з дзвюх глыбінных студняў: у Орлі і Алекшах. У апошняй вёсцы паўстала прадпрыемства вытворчасці напояў і перапрацоўчы фруктова-гароднінны завод.

Цяперашнія грамадска-гаспадарчыя рэаліі характарызуюцца спадам працаўладкавання ў сельскай і лясной гаспадарцы і яго ростам у паслугах. У сувязі з ростам дарожнага руху ў гміне мадэрнізуюцца дарогі; 92% дарог маюць асфальтавае палатно. У галіне электраэнергетыкі рэалізаваны ўсе палажэнні адносна інфраструктуры і электрыфікацыі гаспадарак. Планы прадбачвалі эксплуатацыю залежаў ілаў у наваколлі Орлі для патрэб вытворчасці будаўнічых матэрыялаў.

Яшчэ трыццаць гадоў назад Орлю можна было называць прамысловай вёскай. Да 1974 года працавала тут цагельня. Звыш ста гадоў, да 1995 года, выраблялі ў Орлі кафлю. Пару гадоў таму спыніла працу бетанярня, дзе ад 1965 года выраблялася пустацелая цэгла, пліты для тратуараў, падаконнікі, надмагільныя пліты, тратуарную брусчатку і г.д. У гэтым годзе пляц і будынкі былой бетанярні купіла сям'я Міхалевічаў, сяляне, якія намерваліся трымаць там свінаматкі, але спаткалася гэта з пратэстамі некаторых суседзяў (будынкі стаяць на абочыне вёскі) і войт не даў адпаведнай згоды. Суседзям фермы перашкаджаў бы смурод ад свіней, але іншым, якія атрымалі б там працу, той самы смурод не перашкаджаў бы. Згаданыя прадпрымальнікі ад гадоў гаспадараць у былой цагельні, але яна на калёніі Антанова.

Год назад быў ліквідаваны мясцовы ГС. У гміне вялікае беспрацоўе.

Міхал Мінцэвіч

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Фота КРЫСТЫНЫ КАСЦЕВІЧ

Барбара Шчарбінская вучыла студэнтаў рыхтаваць праекты для атрымання грантаў

Еўропа меншасцям — меншасці Еўропе

У канферэнцыі „Еўропа меншасцям — меншасці Еўропе", арганізаванай у Гайнаўцы з 8 па 10 лістапада Беларускім аб'яднаннем студэнтаў, прынялі ўдзел прадстаўнікі беларускіх, украінскіх, лэмкаўскіх і яўрэйскіх маладзёжных арганізацый. У час мерапрыемства моладзь знаёмілася з еўрапейскімі ўстановамі, якія падтрымоўваюць дзейнасць нацыянальных меншасцей. Барбара Шчарбінская з Фонду развіцця лакальнай дэмакратыі ў Беластоку знаёміла з дакументамі, неабходнымі для хадайніцтва за грантамі ў еўрапейскіх фондах і арганізацыях.

— Збіраемся ўваходзіць у Еўрасаюз і трэба ведаць на якую дапамогу еўрапейскіх фондаў можам разлічваць, — заявіў Міраслаў Пац, старшыня Беларускага аб'яднання студэнтаў.

Алег Латышонак з Універсітэта ў Беластоку знаёміў прысутных з рэзультатамі, якіх дабіліся прадстаўнікі беларускіх і праваслаўных арганізацый у самаўрадавых выбарах на Беласточчыне арганізаваных ад пачатку дзевяностых гадоў. Гаварыў ён аб поспеху выбарчых камітэтаў у Бельску-Падляшскім, Гайнаўцы і меншых гмінах. Аналізуючы вынікі апошніх выбараў, Алег Латышонак звярнуў увагу на ўдзел у выбарах Беларускага выбарчага камітэта. Хаця не ўвёў ён сваіх кандыдатаў у ваяводскі сеймік і гарадскую раду, то згуртаваў вакол сябе частку беларускага грамадства. Мовавед Тамаш Віхяркевіч з Познаньскага універсітэта расказаў пра юрыдычныя ўмовы развіцця моў нацыянальных меншасцей у Еўрасаюзе. Звярнуў ён увагу на Карту моўных правоў, якую падпісалі 10 еўрапейскіх краін. Гарантуе яна дадатковыя правы для развіцця моў і дзейнасці нацыянальных меншасцей, стварае магчымасці карыстацца некалькімі мовамі ва ўстановах, крамах і навучаць родным мовам у школах.

Студэнты разважалі як можна было б прымяніць гэтыя правы ў Польшчы, якая не падпісала карты. Малгажата Пісаркевіч з Саюза яўрэйскіх гмін пазнаёміла прысутных з яўрэйскай абраднасцю.

— Канферэнцыя пасадзейнічала знаёмству моладзі розных нацыянальных меншасцей. Можа гэта спрычыніцца да супольных праектаў фінансаваных еўрапейскімі фондамі, — лічыць Міраслаў Пац. — У бліжэйшы час намерваемся арганізаваць курсы для моладзі нацыянальных меншасцей з Польшчы, Літвы і адной з краін Еўрасаюза.

Аляксей Мароз

Канферэнцыя „Беларускае культурнае жыццё ў II Рэчы Паспалітай"

Народ без культуры не можа існаваць!

Кафедра беларускай культуры Беластоцкага універсітэта і Беларускае гістарычнае таварыства былі галоўнымі арганізатарамі міжнароднай канферэнцыі пад назвай: „Беларускае культурнае жыццё ў II Рэчы Паспалітай", якая 7-8 лістапада праходзіла ў Беластоку.

Канферэнцыя пачалася ў Музеі скульптуры Альфонса Карнага з адкрыцця выставы „Беларускае мастацтва ў II Рэчы Паспалітай" Ленай Глагоўскай, якая прывітала ўдзельнікаў такімі словамі: „Народ без культуры не можа існаваць! Доўга не знялі мы нічога аб культуры Заходняй Беларусі. У II Рэчы Паспалітай яна, супраць палітыкі, захавалася ў архівах, бібліятэках і прыватных калекцыях, якіх частка трапіла і ў нашы рукі". Удзельнікі канферэнцыі мелі магчымасць паглядзець карціны Вольгі Пракаповіч, Пётры Сергіевіча, Льва Дабжынскага і фатаграфіі Язэпа Фарботкі.

На працягу двух дзён з дакладамі выступілі навукоўцы з Гродна, Брэста, Мінска, Вільні, Варшавы і Беластока, якія наблізілі слухачам, у тым ліку і студэнтам, якіх шмат прыбыло на канферэнцыю, галоўныя праблемы культурнага жыцьця беларусаў таго часу.

Даклады былі разнастайныя. Культурнае жыццё шляхецкай сядзібы і беларускай вёскі на Гродзеншчыне, Навагрудчыне былі тэмамі даследаванняў гродзенскіх вучоных — Святланы Словік, Вольгі Мазь і Сяргея Токця. Выступленні прафесараў Сяргея Габрусевіча з Гродна і Яўгена Мірановіча з Беластока аб адносінах польскай палітычнай паліцыі да беларускага культурнага руху і аб дзейнасці беларускай інтэлігенцыі ў Вільні ў ацэнцы польскай адміністрацыі закончыліся гарачай дыскусіяй удзельнікаў.

Вялікім зацікаўленнем карысталіся выступленні Юры Туронка з Варшавы на тэму беларускага выдавецкага руху ў II РП і прафесара Генадзя Цыхуна, які расказаў пра мову беларускіх выданняў у міжваеннай Польшчы. Апошні з іх прадставіў сваю тэму і, прымаючы ўдзел у дыскусіі, адказваў на пытанні з такой лёгкасцю і гумарам, што прысутныя на канферэнцыі студэнты доўга будуць яшчэ пад уражаннем гэтага выступлення.

Аляксей Марачкін — выдатны беларускі мастак у сваім дакладзе аб беларускім мастацтве ў Заходняй Беларусі наблізіў слухачам найбольш характэрныя постаці гэтага перыяду — Язэпа Драздовіча і Міхася Сеўрука. Аб беларускім нацыянальным стылі ў дойлідстве расказаў Сяргей Харэўскі з Вільні.

Першы дзень канферэнцыі закончыўся канцэртам беларускай музыкі міжваеннага перыяду ў Комплексе музычных школ імя І. Я. Падарэўскага. З песнямі на словы Янкі Купалы, Якуба Коласа і Марыі Канапніцкай выступілі мінчанкі Таццяна Цыбульская (спеў) і Таццяна Лазуткіна (фартэпіяна). Выканалі яны таксама творы Яна Тарасевіча, што было дапаўненнем прэзентацыі кніжкі Ганны Кандрацюк „W stronę Tarasiewicza".

Пятніца, 8 лістапада, пачалася складанымі, а заадно і цікавымі тэмамі аб фарміраванні нацыянальнай свядомасці насельніцтва Заходняй Беларусі, удзеле каталіцкага духавенства ў культурным жыцці міжваеннай Польшчы, як і яго адлюстраваннем на старонках эміграцыйнага друку, якім свае даклады прысвяцілі Аляксей Пяткевіч, Янка Трацяк і Ніна Баршчэўская.

Самымі цікавымі аказаліся выступленні Таццяны Поклад з Вільні аб беларускім музеі імя Івана Луцкевіча ў Вільні, і Аляксандра Смалянчука з Гродна, які прадставіў слухачам асобу Рамана Скірмунта — аднаго з кіраўнікоў беларускага руху. Даклад гэты, поўны дэталёвых інфармацый не толькі аб палітычнай дзейнасці, але і прыватным жыцці Рамана Скірмунта, выклікаў здзіўленне, а часам і гучны смех. Складалася ўражанне, што даклад мае форму дэтэктыўнага рамана, які змяшчае ў сабе не толькі элементы біяграфіі, але і жыццёвыя парадоксы.

Займаючыся культурным жыццём беларусаў міжваеннага перыяду нельга абмінуць класікаў беларускай літаратуры. Святлана Чувак з Гродна свой даклад прысвяціла выданням Якуба Коласа ў Заходняй Беларусі, а Віталь Скалабан з Мінска, гаворачы аб культуры Заходняй Беларусі ва ўспрыманні афіцыйнага Мінска ў 1930-я гады, чытаў слухачам вершы Янкі Купалы. Сваё выступленне пачаў ад верша „А ў Вісле плавае тапелец", які паўстаў пасля спробы самагубства аўтара, але адразу спадар Скалабан прадставіў знойдзены ў архіве другі верш з 1930 года, які пераклікаецца з папярэднім, пад загалоўкам „Знікнуць хмары над калгасам".

Канферэнцыя закончылася ў пятніцу вечарам. Удзельнікі лічаць, што такога тыпу спатканні павінны адбывацца часцей, бо яны не толькі паглыбляюць нашы веды, але і прымушаюць да большай працы над тэмамі, якія да гэтай пары не даследаваліся. Падобную думку выказалі прысутныя на канферэнцыі студэнты, якія дэкларавалі ўдзел у наступных навуковых сустрэчах.

Паўліна Шафран

Вачыма паляка

Чужыя — гэта мы

Так, вось, думаю сабе: калі б мелі мы ў рэгіёне, ці хоць бы ў самім Беластоку, больш нацыянальных і этнічных груп, было б нам жыць адны з аднымі прасцей і менш канфліктна. Так, як, для прыкладу, у шматкультурным Таронта ў Канадзе. Жывуць там людзі, якія паходзяць з амаль 170 краін, валодаючыя ста мовамі, вядома, якія таксама размаўляюць па-англійску (ды хто ж ім у кожным большым ці меншым горадзе свету не валодае!). На вуліцах Таронта відаць белых, чорных, жоўтых і шмат расавых „мяшанак". Крамы захвочваюць падвойнымі надпісамі ці толькі шыльдамі на мове іншай чым англійская. І прытым нікому не прыходзіць у галаву, каб з гэтай прычыны галасіць, тым больш з парламентарнай трыбуны. Галодныя могуць сабе пад'есці ў кітайскіх, італьянскіх шынках, з кухняй амерыканскай, французскай, але ёсць і індыйска-пакістанска-кітайскі шынок. Гэта таксама нікога не здзіўляе, а нават больш — прыцягвае крыху „экзатычным" спалучэннем самых адрозных кулінарных традыцый.

Аднак, жыццё ў Таронта не палягае на магчымасці разнакалібернасці нацыянальных кухняў кожны дзень. Кожная нацыя поўнасцю ўдзельнічае ў грамадска-палітычным жыцці горада, без ніякіх выбарных парогаў, без патрэбы асаблівага экспанавання свае нацыянальнае прыналежнасці і абароны ўласных правоў. Пры тамтэйшым магістраце ёсць спецыяльныя ячэйкі, якія займаюцца праблемамі паасобных нацый і этнічных груп. У школу была ўведзена праграма — „Чужыя — гэта мы", заданнем якой ёсць абвастрыць у маладых жыхарах Таронта акцэптацыю „іншых" і павагу для нацыянальнай, расавай, канфесійнай дыферэнцыяцый. Вядома, у такім тыгелі мусіць даходзіць да сутыкнення асоб рознага паходжання. Але ніхто з гэтага ў Таронта не стварае праблемы. Няма боязі дэнацыяналізацыі і ў нікога няма патрэбы, каб абараняць сваю нацыянальную, этнічную прыналежнасць. Адменнасць, менавіта, ёсць вартасцю і чымсьці, чым можна карыстацца дзеля ўласнага ўсебаковага развіцця, выхоўваючы дзяцей.

Тое, аднак, што магчыма ў Таронта, немагчыма ў Польшчы, а асабліва ў Беластоку. Найлюднейшая нацыянальная меншасць — беларусы разам з украінцамі, татарамі, ромамі ці рускімі — гэта толькі ўзмежак у сталіцы Падляшша. Тут справа не так у яе шматлюднасці, як механізме дзеяння ў грамадстве, які ніякая са знаці кіруючых дасюль горадам і рэгіёнам не хацела выпрацаваць. Усё паўтаралася: беларусы, украінцы і г.д. гэта польскія грамадзяне, якія карыстаюцца тымі самымі дарогамі, той самай аховай здароўя, дыхаюць тым самым паветрам і г.д. Дык нашто асабліва займацца тымі пытаннямі? Да таго ж дзейнічаюць меншасныя арганізацыі. На маю думку, не толькі мясцовая ўладная знаць, але тым больш цэнтральная не маглі зразумець, што „чужыя — гэта мы", што, так сказаць, „лапаталагічна" ўбіваецца ў галовы ўжо дзецям у Таронта. З такімі ж праблемамі, што ўсе (палякі, католікі), але і сваімі клопатамі ды прагамі. Дапамагчы ім развязаць іх ды рэалізаваць можна толькі выключна трактуючы меншасці ў асаблівы спосаб, займаючыся імі асабліва, не ставячы перад дылемай: датацыі на дарогу ці для меншасці.

Ды, хацелася б сказаць: дзе Рым, дзе Крым (чытай: дзе Беласток, а дзе Таронта). Усё ж, ёсць у мяне прапанова новым самаўрадавым уладам Беластока і ваяводства. Паколькі заўсёды любілі яны падпісваць дамовы аб супрацоўніцтве з сестрынымі гарадамі, дык можа так, замест з іншымі гарадскімі цэнтрамі, пасябраваць нам якраз з канадскім Таронта? Можа, у рамках сестрыное (брацкае?) дружбы „залапаліся б" мы на зношаныя аўтобусы (як было гэта з падарункам галандцаў Беластоку) ці імглістыя абяцанні італьянцаў наконт пабудовы беластоцкага аэрадрома. Прыдалося б мець прыбытак яшчэ ў нечым, што прыносіла б адсоткі большыя чым шматгадовая інвестыцыя — у „абучэнні" як жыць з „іншымі". Гэта я, мабыць, толькі так: і так ніхто з адказных за наш горад ды рэгіён пра маю прапанову не прачытае — не пераадолее беларускіх літар!..

Мацей Халадоўскі

Лепшыя працы VII Конкурсу беларускай паэзіі і прозы

Я — празаічная дзяўчына

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

З Зосяй ЛЕМЕШ, лаўрэаткай VII Конкурсу беларускай паэзіі і прозы гутарыць Ганна КАНДРАЦЮК.

— Ці прысніўся табе сон наконт конкурсу?

— Апошнім часам прысніліся мне словы. Я гаварыла нешта на беларускай мове. Доўгія, цяжкія, разумныя словы.

— Значыць, наштодзень размаўляеш па-польску.

— Усяк: у хаце мы размаўляем „пасвоему" і па-польску.

— Ты добра і цікава гаворыш па-беларуску.

— Я адчуваю сябе беларускай.

— Скажы нешта пра сябе.

— Вучуся ў III класе беларускага ліцэя ў Гайнаўцы. Урокі роднай мовы выкладае ў нас прафесар Ян Карчэўскі. З другога класа я пішу ў „Ніву".

— Ты — адкрыццё нашага „Астрона". Значыць, прыйшла да нас „праз сон".

— Рубрыка „Вер — не вер" зацікавіла мяне, бо там былі лісты. Я да канца не ведала, ці пішуць іх чытачы, ці сама рэдакцыя. Я рашыла праверыць. Не думала, што атрымаю адказ „Астрона".

— Як твае публікацыі ў „Ніве" прымаюць сябры?

— Сябры зараз жартуюць. Раней усе маўчалі.

— Каторы раз ты ўдзельнічаеш у конкурсе?

— Першы раз.

— Ці больш табе падабаецца літаратура, ці публіцыстыка?

— Лепш адчуваю сябе ў публіцыстыцы. Я — не паэтка, я — цалкам празаічная дзяўчына.

— Маеш на думцы прозу?

— Мой поспех у літаратурным конкурсе гэта справа шчасця; я нават не здзіўляюся, я маю шчасце ў жыцці.

— Напэўна, шмат працуеш, каб быў той поспех?

— Кожны дзень пішу нешта на беларускай мове. Мне падабаецца працаваць і думаць так, як падказвае мая інтуіцыя.

— Кім хочаш стаць у жыцці — журналісткай, літаратаркай?

— Стаматолагам. Чаму? Бо гэта сямейная прафесія, а сапраўды таму, што гэта канкрэтны занятак. Хачу жыць на Беласточчыне.

— Цікава.

— Я не ўяўляю сабе жыць недзе далёка ад Беласточчыны.

Зося Лемеш

Кветка

— А што ты тут робіш, так цалкам адна, пасярод поля?

Паглядзеў ён на маладую дзяўчыну, якая, быццам тая веснавая кветка, вырасла нечакана перад ім. Так ён яе і ў думках назваў — „кветачка".

— Але ж я цябе і ведаю! Не баішся хадзіць адна так далёка?

Ці дзяўчына баялася? Мела дзіўныя, нібыта спалоханыя, нібыта задуманыя вочы... Не, не было ў іх страху.

— А мяне ты не баішся?

Толькі ўсміхнулася.

— Дык сядай, кветачка, паразмаўляем. Садзіся тут. Ці чуеш? Гэта сэрца зямлі б'е. Чым бліжэй ты да зямлі, бліжэй да яе сэрца, тым бліжэй да Бога. А ў цёмнай зямлі жывуць брыдкія, слізкія і сляпыя дажджавыя чарвякі, якія баяцца сонца і дня... Людзі прывыклі баяцца гэтых дзяцей цемры. Думаем, яны — нешта кепскае. Думаем — добра ім так, пэўна Бог іх пакараў. А мне здаецца, дажджавыя чарвякі найшчаслівейшыя ў цэлым свеце. Жывуць лепш чым мы, яны ж бліжэй Бога. Бо Бога няма, як некаторыя кажуць, у небе, няма ў цэрквах. Ён ёсць у зямлі нашай, з якой мы нарадзіліся і на якой жывем, Ён ёсць у кожным чалавеку. Адчуваеш ты ў сабе Бога, кветачка?

Чула жаваранкаў над лугам, чула вецер сярод маладых траваў, адчувала муху шпацыруючую па яе руцэ, позірк мужчыны на яе твары... Пачала баяцца.

— Няма, няма Бога ў мяне!

— А чуеш, як птушкі спяваюць, як травінкі да сябе нешта шэпчуць ціхенька?

Апусціла вочы, пачырванела. Ці гэты чалавек чытае ў яе думках?!

Гэта ж Бог, кветачка! Бога ты чуеш!

* * *

— Мо паразмаўляем пра каханне?

Махнула рукой, быццам хацела сказаць, не варта.

— Чаму? Не кахаеш ты нікога? Не маеш хлопца?

Што за чалавек! Кінуў бы ўжо дапытвацца! Гэта не яго справа!

— Не злуй, кветачка, знойдзецца хлопец. Не было проста яшчэ такога, што быў бы цябе варты.

Працягваў, хаця ў вачах яе не знайшоў ні даверу, ні вялікае надзеі.

— Ведаеш, што ёсць самым цудоўным, калі людзі кахаюць адзін аднаго?

Адкуль, адкуль ёй гэта ведаць?!

— Самай цудоўнай ёсць тая магутная сіла, якую дае нам каханне. Сіла, якая дазваляе нам перажыць няўдачы, падняць галаву і ісці далей. Калі б не яна, не ведаю, ці размаўлялі б мы сёння...

Каханне дае людзям сілу?

— Каханне дае намнога больш. Дае ШЧАСЦЕ. Кветачка, ты...

Так, плакала, і што з таго?! Навошта, навошта яна сюды прыйшла!

* * *

— Кветачка, бачыш, мы нават не заўважылі, як сонца зайшло...

* * *

— Кветачка, калі я перамагу Час і Прастору, тады ты ў цяжкай хвіліне падумай толькі аба мне, а я прыйду да цябе. Аднак тады не буду адчыняць ужо дзвярэй ні вакон... Але ці я Іх перамагу? Ці мне пашанцуе?... Калі не, дык не буду я годны пабачыць твой тварык, кветачка.

* * *

І пайшлі, кожнае ў свой бок.

* * *

Я так доўга чакаю! Дзе ж Вы, дзе?

Пятро Акулік

Пакуты сабакі Шарыка альбо Як дзядзька Ясь стаў філосафам

Хутка Каляды, Новы год, прыедуць дзеці з унукамі. Трэба схадзіць у лес па ялінку, — думае дзядзька Ясь. Надзеўшы кажушок ды валенкі, бярэ ў руку сякеру, складвае вусны ў трубачку, каб свіснуць сабаку. — Фу-фу — замест посвісту атрымліваецца нейкае змяінае шыпенне. От, незадача! Сёння зранку Ясь дастаў арэхі, каб унукаў на Новы год пачаставаць і вырашыў аднаго разгрызці, ды толькі пстрыкнуў той зуб, вылецеўшы з рота, а арэх цэлы! Дзядзька ізноў старанна выцягвае вусны, каб свіснуць, і, паўторна выдае на свет божы замест слаўнага салаўінага посвісту нейкую непатрэбшчыну. „Фу! Цьфу! Шарык! Каб ты здох!"

Шарык не застаўляе сябе доўга чакаць і ўжо матляе хвастом перад гаспадаром. Гаспадар жа, задраўшы галаву, калупаецца пальцам у роце, дзе нядаўна яшчэ сядзеў зуб.

Пад Ясевымі валенкамі хрупае снег, сабака ад радасці наматвае вакол Яся кругі. „Добры сабака, — думае Ясь, — добра, што не здох. Тыдні з тры таму зарэзаў дзядзька бычка. А каб з вантробамі не валэндацца, аддаў іх сабаку. Ну, той і дарваўся... Праз колькі часу быў Шарык бы той гарбуз — свежаніны з'еў больш, чым сам важыць, гаўкаць нават не хацеў, ды і не мог ужо, бо ледзве дапоўз да буды. Адным словам „сабачы перажор атрымаўся".

Уначы Ясь прачнуўся ад таго, што жонка таўкла яго ў бок: „Ясечку, мабыць нехта памёр. Чуеш, Шарык вые, як па нябожчыку". Дзядзьку стала неяк не па сабе, па скуры пабеглі халодныя мурашкі, — можа з кумам Уладкам што зрабілася, бо неяк аслабеў той на другой бутэльцы першачку, калі свежаніну спрабавалі.

Ясь у адных споднях выйшаў на ганак, кінуў сабаку кавалак хлеба, ад чаго, здаецца, той завыў яшчэ мацней.

Залазячы пад коўдру, Ясь, каб хутчэй нагрэцца, прыціснуўся да жонкі.

— І чаго гэтак вые? — запытала яна.

— Чаго-чаго. Да сучкі хоча, — адказаў Ясь. Жонка хіхікнула.

— А ты чаго?

— А я, вось, думаю, Ясечку, калі ўжо ты завыеш?

Зранку, калі Ясь ішоў ад студні з вядром вады (моцна даймала смага пасля першаку), Шарык не проста выў, ён гэтак заграбаў зямлю лапамі, што аж камякі яе ляцелі ўва ўсе бакі.

— А можа да сучкі хоча? Адпушчу кавалера.

Шарык амаль не збіў з ног Яся, і хутчэй кулі папёр у бок сажалкі, калі дзядзька адчапіў ад ашыйніка ланцужок. Карціна, якую Ясь убачыў, вельмі яго ўразіла, — сабака гаўкаў на ваду, потым піў, потым ізноў гаўкаў і піў.

Вялікая смага мацней кахання, — зрабіў выснову дзядзька Ясь.

Магдаліна Леанчук

Мой малы вялікі свет

Мая залатая клетка сталася
маім ПРАКЛЯЦЦЕМ
Не мела я ніколі выбару... не маю...
не буду ніколі яго мець...

УЦЁКІ — які сэнс іх?

Устойлівы паляўнічы заўсёды знойдзе
звярыну
Чую як вакол маёй шыі зацісканецца
пятля...
Не магу дыхаць... душуся я...
А дык пастаянна жыву...
Я памерла ў час жыцця, ажыву пасля смерці...

Цень чалавека

Самотнасць гэта маё другое імя,
Боязь гэта мая сястра,
Страх — мой брат, а Боль і Роспач
гэта мае бацькі.

Сэрца маё крывавіць, хаця цела
на від здаровае.

Штораз надзяваю я дзве маскі:
для свету і для маёй раненай душы.

На від шчаслівая, сапраўды ўражлівая
на кожны боль.

Баюся адмовы, баюся пачуць
гэтыя словы, якія як прыгавор
асудзяць мяне на адчужэнне і самотнасць...

Боль, Роспач, Боязь, Страх...
Не плачу я, бо не хапае мне слёз.
Прагну толькі аднаго: быць каханай,
Але ці прагну кахаць?

Выбачай мне...

1
Перапрашаю за словы,
якіх я ніколі не прамовіла.
Перапрашаю за думкі,
якіх я ніколі не выявіла.
Перапрашаю за любоў,
якой я ніколі табе не аказала.
Перапрашаю за кожную слязу,
кожную калючку...
2
Так многа зла, так мала часу...
У чым мая памылка?
У чым мая віна?
3
Я крыўдзіла цябе
Мы цярпелі разам
аднак асобна
Ты гасла з кожным днём
а я не змагла раздзьмухаць
твайго агню
Ты плакала
нада мною
Я — над сабою
4
Я не здолела сказаць
гэтых двух, простых слоў
ЛЮБЛЮ ЦЯБЕ
** * **
Шкадую...

Зорка

старонка для дзяцей

Мартынка Леанеўская — „Сончык”!



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Рэдакцыя „Зоркі” гутарыць з Мартынай Евай Леанеўскай

— Ты ўжо другі раз атрымала вылучэнне на Агульнапольскім конкурсе беларускай паэзіі і прозы. Як пачалося тваё зацікаўленне творчасцю на беларускай мове?

— Пра конкурс я даведалася ад цёці, Міры Лукшы. Пісаць заахвочвала наша пані, настаўніца беларускай мовы.

— Дзе вучышся?

— У Нараўцы, хаджу ў першы клас гімназіі.

— Разам з табой у конкурсе ўдзельнічалі твае сваякі.

— Мой дваюрадны брат Радаслаў і бабуля Зіна.

— Калі ты пісала верш пра „капці бабулі”, думала пра яе?

— Так, я засумавала па бабулі Зіне, і таму напісала гэты верш.

— Ці любіш чытаць кніжкі?

— Найбольш мне падабаецца фантастыка.

— А беларускіх аўтараў ведаеш?

— Чытаю Віктара Шведа.

— На польскай ці беларускай мове?

— На польскай.

— А якіх аўтараў ты прачытала па-беларуску?

— Гэта вершы і апавяданні, якія ў нашых падручніках. Яны мне вельмі падабаюцца.

— Хто дапамагае табе працаваць над беларускімі творамі?

— Найбольш мама.

— Ты хочаш, як твая цёця, працаваць у рэдакцыі „Нівы”?

— У мяне іншыя мары. У жыцці я хацела б быць юрыстам.

— Пракурорам ці адвакатам?

— Не ведаю яшчэ...

Гутарыла Ганна КАНДРАЦЮК

Польска-беларуская крыжаванка № 47:

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 43: Мураш, вакал, асоба, колер, бал, цырульнік, рада, стан, кладоўка. Моц, цырк, рыс, буда, шакалад, соль, вол, абеліск, карэкта, лагчына.

Узнагароды, **аўтаручкі**, выйгралі: **Наталля Ракоўская**, **Паўліна Дзмітрук** і **Марыёла Кананюк** з Нарвы, **Анна Хількевіч**, **Дарота Праховіч** і **Магдаліна Якуц** з Бельска-Падляшскага, **Каміля Трэска**, **Кася Кузьміч** і **Эвеліна Лавіцкая** з Гарадка. Віншуем.

Вершы Віктара Шведа

Даношчыкі

— Цяжка калісь жылося,
Мой мілы ўнучак, Жэня,
Я заўсягды даношваў
Сямейнікаў адзенне.

— Даношваю, вядома,
Я, дзедка, рэчы брата.
— У нас, унучак, дома
Былі толькі дзяўчаты.

Запозненая чыгунка

Не атрымаўшы дарунку
Бацьку сынок пытаецца:
— Скажы, якая чыгунка
На свеце найбольш спазняецца?

— Не адкажу табе толкам,
Не назаляй, Валодзя.
— Тая, што меўся пад ёлку
купіць мне ў мінулым годзе.

Уладзімір АРЛОЎ, Адкуль наш род

Паўстанне Тадэвуша Касцюшкі

Апошні бой Касцюшкі

У кастрычніку паўстанцкі камандзір прыняў свой апошні бой. Гэта здарылася ў Польшчы пад Мацяёвіцамі. Там калона паўстанцаў, якую Касцюшка вёў на Варшаву, сустрэлася з царскім войскам.

Бітва доўжылася цэлы дзень. Гарматны агонь расіян рассеяў паўстанцкую кавалерыю. Мужныя, але дрэнна абучаныя касінеры палеглі ад куляў і штыкоў царскай пяхоты.

Касцюшка ў роспачы ездзіў на кані сярод параненых і забітых. Ён таксама хацеў загінуць са сваімі паплечнікамі па барацьбе. Нейкі салдат стрэліў па ім, але трапіў у каня. Тадэвуш вылецеў з сядла на дол, і да яго кінуліся царскія казакі. Каб не аддацца ў рукі ворагам, ён хацеў застрэліцца, аднак пісталет даў асечку. Царскі афіцэр ударыў бяззбройнага паўстанца шабляю па галаве.

Непрытомнага паўстанцкага камандзіра захапілі ў палон, адвезлі ў Пецярбург і пасадзілі ў самую страшную расійскую турму, што знаходзілася ў Петрапаўлаўскай фартэцы. Праз год у адной з суседніх камер з'явіўся яшчэ адзін важны вязень — былы кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў. Ягонай дзяржавы ўжо не існавала.

Пасля паланення Касцюшкі камандаваць узброенымі сіламі паўстанцаў быў прызначаны таксама наш зямляк Тамаш Ваўжэцкі.

Аднак сілы змагароў слабелі. Расійскія войскі штурмам авалодалі Пражскім прадмесцем Варшавы. Загадам Суворава ягоныя салдаты вынішчылі ўсіх мясцовых жыхароў. За ўзяцце Варшавы, якую разам з палякамі абаранялі і беларускія паўстанцы, адданы царскі служака Суворaў атрымаў званне фельдмаршала.

Тадэвуш Касцюшка пасля вызвалення з царскай турмы да скону дзён жыў на чужыне.

Нават у старасці ён амаль кожны дзень выпраўляўся на конную прагулянку. Конік у былога паўстанцкага камандзіра быў рахманы і кемлівы. Калі па дарозе сустракаўся жабрак, конь сам спыняўся, бо ведаў, што ягоны гаспадар абавязкова дасць гэтаму няшчаснаму чалавеку грошай.

Пасля паўстання дзесяткі тысяч беларусаў мусілі пакінуць заняволеную чужынцамі Бацькаўшчыну.

Шукаючы прыстанку ў іншых краінах, яны думалі пра тое, як вярнуць роднай зямлі незалежнасць.

Шмат хто з іх запісваўся ў войска да маладога французскага генерала Напалеона.

Напалеон неўзабаве стаў імператарам Францыі. Ён рыхтаваўся да вайны з Расіяй.

Беларусы, якія апынуліся ў ягонай арміі, марылі пра тое, што Напалеон дапаможа вярнуць іх радзіме — Вялікаму княству Літоўскаму — незалежнасць. Але пра гэта пойдзе гаворка ўжо ў наступным апавяданні.

Дзённік Міколы

Белыя сцены

Вечарам я пастукаў у дзверы мастаку Нор Узі.

— Вітаю, вітаю! — сказаў гаспадар і запрасіў мяне ў пакой.

— Ой! Чарапашка прыйшоў! — пажартаваў Ярак. — Ты ведаеш, што спазніўся на дзве хвіліны! Што з табою? Можа, закахаўся?

— Ну і праблема, дзве хвіліны спазнення! — я паглядзеў на сябру, ды той не адставаў:

— Спадар Нор Узі запрасіў на пятую гадзіну, разумееш?

— Мой гадзіннік спазніўся, — я не хацеў спрэчкі і стараўся палагодзіць сітуацыю.

— Іншым разам глядзі на гадзіннік гарадской ратушы!

— Так, так, — махнуў я рукой і змоўк. Мне не хацелася кідацца ў спрэчку за глупства.

— Бо, ведаеш... — азвалася Аня, — мы не можам дачакацца сюрпрыза, які падрыхтаваў нам Нор Узі.

— Хвілінку, усё ўжо падрыхтавана, — і мастак загадаў нам заплюшчыць вочы. У той час Нор Узі адчыніў шафу і дастаў адтуль нейкі прадмет. Праз момант сказаў:

— Добра, расплюшчце вочы!

Мы пабачылі перад сабою вялікую палітру з фарбамі, чатыры пэндзлі і вядро вады.

— О-го! — Ярак схапіўся за галаву. — А што будзем рабіць?

— Разам размалюем мой дом, — усміхнуўся мастак.

— Але ж... ён ужо размаляваны! — здзівіўся я.

— Гэта дробязь, хлопча, — падмаргнуў мне гаспадар. Нор Узі пстрыкнуў пальцамі і ўсе сцены сталі белыя. Мы стаялі, як зачараваныя.

— Калі ласка, — мастак уручыў нам пэндзлі, — бярыцеся за працу.

Я намаляваў гнедага каня, Ярак — касмічную ракету, Томак — зялёны лес, а Аня... А наша Аня намалявала мастака Нор Узі, які малюе нацюрморт.

І так пачалося...

Кожны чацвер мы мелі прыходзіць да мастака і маляваць усё што нам прыйдзе на думку.

У школе ўсе здзіўляліся, бо раптам наша чацвёрка пачала збіраць шасцёркі па пластыцы. Аднойчы паклікаў нас дырэктар школы і сказаў:

— Анна Ляшчынская, Мікола Дораш, Яраслаў і Тамаш Новікі будуць прадстаўляць нашу школу ў Першым міжшкольным конкурсе жывапісу. Вы згодны?

Мы паглядзелі адзін на аднаго і ўсміхнуліся.

— Гэта вялікі гонар, — адказала афіцыйным тонам Аня Ляшчынская.

— Гэта вялікі гонар, — паўтарылі мы, нібы папугаі, за Ляшчынскай.

(працяг будзе)

(нак-с)

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Удзельнікі VII Агульнапольскага конкурсу беларускай паэзіі і прозы

Пра дажджавога чарвячка

Жыў адзін дажджавы чарвячок,
які называўся Кароль.
Трапляліся яму адны няшчасці.
Раз сустрэў асу,
а яна хацела яго ўджаліць.
Але Кароль не даўся,
схаваўся ў зямлі.
У другі раз сустрэў вужа,
які яго хацеў праглынуць.
Кароль не даўся,
схаваўся ў сваю норку.
У трэці раз сустрэў хлопчыка.
Хлопчык узяў Кароля ў руку —
дарослы сказаў яму злавіць
пару дажджавых чарвякоў
на прынаду для рыб.
Паклаў чарвячка ў бляшанку.
Так Кароль пайшоў лавіць рыбу.
Падчапілі яго на вуду,
кінулі ў ваду. Дасталі з вады.
Кароль сарваўся з кручка
і схаваўся ад людзей пад зямлю.

Радаслаў МАЦІЕВІЧ,
II „а" кл. ПШ н-р 6 у Беластоку

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

У беларуска-польскім садку ў Беластоку

Як Шурык з дому ўцякаў

Выйшаў Шурык з хаты на двор. Сумны-сумны.

— Ты чаго такі? — пытаецца дзед. Ён на прызбе сядзіць, на кіёк абапіраецца.

— Вось вазьму і ўцяку з дому, — адказвае Шурык.

— Куды?

— Абы-куды. Давай, дзедка, разам, га?

— Які з мяне ўцякач? На сваім панадворку ногі ледзьве перастаўляю. Я лепш дома пасяджу.

— Добра старому. Ніхто не крыўдзіць.

— Ніяк табе ад маці папала?

— Не любіць яна мяне зусім.

— Ага!

— Купіла ў краме цукерак, шакаладку адну. Я бачыў. Разам хадзілі... Каб хоць пакаштаваць дала.

— Можа, не заслужыў?

— Не заслужыў! Яна кожны раз гэтак кажа, калі не хоча пачаставаць. Заўсёды прычыну знойдзе. То штаны падраў, то цацкі параскідаў, то не дапамагаю.

— Нялёгка табе.

— Цяжка, дзедка. Пайду з дому. Назусім. Тады маці наплачацца. Прасіцца будзе: „Вярніся, сыночак! Усё дарую, крыўдзіць не буду ніколі". Ды позна будзе. Не вярнуся я. Яна загалосіць, пабяжыць за сяло.

— Гм!

— Вось паглядзіш, дзедка. Як выйду за вароты, то і не азірнуся.

— Хочаш, каб пра цябе не забываліся?

— Вядома.

— Тады памяць аб сабе добрую пакінуць трэба.

— Як так?

— Зрабі што-небудзь карыснае.

— Што?

— Дровы ля хлява бачыш?

— Ага.

— Знасі іх пад паветку, складзі там. Толькі памногу не бяры.

— Добра. Змагу.

Пачаў хлопчык працаваць. Палены паколаты не тоўста. Шурык іх па тры зараз браў. Не надта цяжка было.

Доўга працаваў. Ажно ўспацеў. Але ўсе дровы склаў. Скончыў, падышоў да прызбы, пытаецца:

— Ну як, дзядуля?

— Акуратна зроблена. Яшчэ б двор падмесці варта.

Уздыхнуў Шурык. Аднак венік узяў. Няхай бачаць, якога добрага чалавека зжылі. Няхай пашкадуюць!

І пачаў падмятаць. Старанна, не спяшаючыся.

Толькі скончыў — маці выйшла. Агледзела двор, усміхнулася.

Шурык у хату шмыгнуў: не стаяць жа на вачах.

Паглядзела мама на чысты двор, на складзеныя дровы. Таксама ў хату пайшла.

Адзін дзядуля на прызбе застаўся. Сядзіць, грэецца пад сонцам.

Прайшло крыху часу, выйшаў на ганак Шурык.

— Склаў торбу? — пытаецца дзед.

— Якую торбу?

— Кожны, хто ў дарогу збіраецца, харчы нарыхтаваць павінен. Ты ж, мабыць, не за блізкі свет адправішся?

— А-а... — адказаў Шурык. — Толькі я ўцякаць перадумаў. Застаюся. — І аблізаў выпацканыя ў шакалад пальцы.

Даір СЛАЎКОВІЧ
(„Навошта ружы калючкі")

Конкурс — Класікі

Рэдакцыя „Зоркі" адзначае 120-ю гадавіну з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа. Мы прапануем шэраг конкурсаў. Мэта конкурсу — адукацыйная. Задача чытача — выбраць правільныя адказы. Аўтары правільных адказаў выйграюць беларускія кніжкі.

1. У „Новай Зямлі" апісана жыццё:

а) вёскі,

б) горада,

в) джунгляў.

2. Якуб Колас, калі пісаў „Новую Зямлю", меў на думцы:

а) Мінск,

б) урочышча Альбуць,

в) Варшаву.

3. Янка Купала праславіўся ў літаратуры як:

а) рэаліст,

б) рамантык,

в) сімваліст.

Адказ на Конкурс — Класікі ў „Зорцы" н-р 41: 1) Янка Купала напісаў драму „Тутэйшыя". 2) Якуб Колас доўгі час працаваў настаўнікам. 3) Цэнтральны музей Якуба Коласа знаходзіцца ў Мінску.

Кніжку Янкі Купалы „Тутэйшыя" выйграў **Янка Захарчук** з Беластока.

Баяры

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Уладзіслаў Петрук і ягоныя карціны

Петрукова Падляшша

Уладзіслаў Петрук, вядомы чытачам „Нівы" як аўтар „Свойскіх малюнкаў" (працаваў графічным рэдактарам нашага тыднёвіка з 1986 г. па 1992 г.), працягвае сваю руплівую працу дакументавання пёркам на паперы нашага краявіду і культуры. Яго рэтраспектыўную выставу можна глядзець у Малой галерэі Беластоцкага асяродка культуры, у фае кінатэатра „Форум" (вул. Легіяновая, 5). Аўтар — сёння беластачанін, нарадзіўся ў 1952 годзе ў Наройках каля Драгічына. Ён — выпускнік Мастацкага ліцэя ў Супраслі і Вышэйшай школы графікі і кніжнай графікі ў Лейпцыгу (стыпендыст Міністэрства культуры і мастацтва). Пасля працы ў „Ніве" быў кіраўніком Выдавецтва філіяла Варшаўскага універсітэта ў Беластоку, ад 1988 г. кіруе ўласным выдавецтвам. Ён — аўтар 18 кніжных выданняў, сярод гэтага аднаго альбома „Stare jest piękne", плакатаў, кніжных ілюстрацый, удзельнік шэрагу выставак у краіне і за мяжой. Член Праваслаўнага брацтва св.св. Кірылы і Мяфодзія, спявае ў царкоўным хоры.

— Малюючы архітэктуру і прыроду Падляшша дакументую старыя прыклады будаўніцтва вёскі, мястэчак, сакральнага (цэрквы, касцёлы, каплічкі), помнікі прыроды, — адзначыў у сваёй лістоўцы-паштоўцы Уладзіслаў Петрук, які стартаваў сёлета са спіска (першае месца) Беларускага выбарчага камітэта ў Гарадскую раду Беластока. У радзе марыў заняцца праблемамі культуры. Зазначаў:

— Неабходна дбаць пра эстэтыку горада. Нашы раёны-спальні трэба замяніць у прыязныя чалавеку, з магчымасцю доступу да культуры і адпачынку на месцы.

Дакладныя эскізы аб'ектаў паказваюць кожную цаглінку, кожны лісточак, фактуру кары старых дрэў. Захапілі мяне, напрыклад, карціны прысады вербаў у Бабровай (некалькі графік з таго месца), палацавых паркаў у Дайлідах ці Браніцкага, старыя дамы на беластоцкіх Баярах (шмат з гэтых свойскіх хацінак ужо не існуе).

Уладзіслаў Петрук — аўтар гэтак званых папак з графікамі, м.інш. „Бельск-Падляшскі", „Беласток і ваколіцы, „Цэрквы Беластока", „Цехановец", „Драгічынская дыяцэзія", „Белавежская пушча — Шлях каралеўскіх дубоў", „Беласток даўней і сёння". Гораду Лаймену падараваў кнігу „1200 гадоў Лаймена" (250 малюнкаў). Па заказе нямецкага горада Розбах выканаў 60 малюнкаў ягонае архітэктуры.

— Маё крэда — права на свабоду, адметнасць, індывідуальнасць, — адзначае стыпендыст падляшскай маршалкаўскай установы (дзякуючы гэтай стыпендыі мастак мог рэалізаваць выставу).

Міра Лукша

Сучаснае народнае мастацтва Літвы

Восьмага лістапада 2002 года ў беластоцкай Ратушы адбылося адкрыццё выстаўкі сучаснага народнага мастацтва Літвы. Патранат над мерапрыемствам узялі міністэрствы культуры Польшчы і Літвы ды Рада этнічнай культуры літоўскага Сейма. Да наладжання выстаўкі спрычыніліся захавальнік Войцех Кавальчук і Ёнас Рудзінскас — аўтар экспазіцыі і старшыня Саюза літоўскіх народных мастакоў.

У беластоцкай Ратушы можна паглядзець працы самых выдатных мастакоў Літвы, якія паказвалі свае працы ў найбольшых гарадах свету. Выстаўка, як сказаў Ёнас Рудзінскас, з'яўляецца невыпадковай па колькасці экспанатаў, якія паказваюць тэхналагічную і рэгіянальную разнастайнасць літоўскіх мастакоў.

Сярод экспанаваных прац можна пабачыць жалезныя крыжы, 10-метровага караля з бурштыну, тканыя ручнікі, карціны, гліняныя збанкі. Сустрэнем тут працы такіх мастакоў, як Ёнас Вэртэляс, Эдгарас Та, Стасыс Раўба, Ёнас Ігнотас, Іпалітас Узкурнус, Юльюс Букаўскас.

Ідэя паўстання такой экспазіцыі з'явілася некалькі гадоў таму, — успамінае Войцех Кавальчук, — а падрыхтоўка да яе была доўгай. Выбар такіх, а не іншых экспанатаў быў спробай паказання культурнай разрозненасці Літвы. Гэта аўтарам удалося.

Выстаўку можна глядзець яшчэ тры тыдні. Пазней на працягу паўтара года наведае яна Вроцлаў, Кракаў і Лодзь, а за два гады трапіць на Літву.

Паўліна Шафран

Фота ПАЎЛІНЫ ШАФРАН

Вяселле і дажынкі

8 лістапада г.г. у ГП БГКТ у Беластоку выступілі беларускія мастацкія калектывы. Самадзейнікі з Бельска пад кіраўніцтвам Алы Фіёнік падрыхтавалі сцэнку з першага дня вяселля на Бельшчыне. Наталька выходзіць замуж. Яе рыхтуюць да шлюбу, заплятаюць валасы, дружкі спяваюць. Прыйшлі сяброўкі, хрышчоная маці, бацькі і родная сястра. Усе яе ўспамагаюць падаркамі. Каравай падрыхтаваны, чакаюць маладога. Урэшце ён прыязджае з кветкамі. Расплываюцца прыгожыя вясельныя песні. Дружкі кідаюць людзям цукеркі. Гэты ж гурт выканаў яшчэ некалькі хрысцінных песень, якія спяваліся і мо яшчэ спяваюцца на Бельшчыне.

Калектыў „Крыніца" з Беластока адрэкамендаваўся абрадавай сцэнкай „Дажынкі". Адзенне падобнае да колішняга вясковага, сярпы, дажынкавы пачастунак і песні аб ураджаі і дажынках — усё гэта пераносіла ў мінулае, якое яшчэ добра помніцца многім прысутным на вечары.

Трэцім абрадавым калектывам на БГКТоўскай сцэне былі „Васілёчкі" з Бельска-Падляшскага пад мастацкім кіраўніцтвам Мікалая Мяжэннага. „Васілёчкі" падрыхтавалі сцэнку з другога дня вяселля. Куфар маладой з каштоўнымі вырабамі мусіць выкупіць малады. Плаціць ён грошы і дае паўлітра гарэлкі. А пасля госці заяўляюць, што гарэлка горкая. Маладыя „салодзяць" сардэчна і тады раздаецца здравіца „Многае лета". У сваю ролю ўваходзіць маршалак. Затым маладая ўручае падарункі бацькам і найбліжэйшым маладога. Усяму гэтаму спадарожнічаюць песні.

Усе тры калектывы паказалі высокі ўзровень мастацтва. Прысутныя з удзячнасцю самадзейнікам вярталіся дамоў.

Міхась Хмялеўскі

Спявай, душа народная, спявай!

Закончыўся сёлетні культурна-асветны сезон у Беларускім грамадска-культурным таварыстве. Трымаю ў руках мінулагоднюю праграму, багатую ў мерапрыемствы — фэсты, Купалле, дажынкі, фестывалі, агляды... Без пераўвеличэння можна сказаць, што мінулы сезон быў надта плённы. Тысячы жыхароў шматлікіх вёсак і гмін нашага ваяводства мелі магчымасць удзельнічаць у мерапрыемствах з удзелам беларускіх калектываў Беласточчыны і Рэспублікі Беларусь. Нашым калектывам была створана магчымасць прэзентаваць культуру беларусаў Беласточчыны ў іншых раёнах Польшчы і ў Беларусі.

Фэсты і народныя гулянні ў вясковым асяроддзі часта былі адзінымі культурнымі мерапрыемствамі даступнымі сялянам, а таксама нагодай для сямейных ды сяброўскіх сустрэч. Людзі ахвотна прыходзілі на фэсты паслухаць прыгожыя беларускія песні ў выкананні нашых самадзейнікаў і артыстаў з Беларусі, паглядзець майстэрства танцавальных калектываў, пазахапляцца віртуознасцю музыкантаў — баяністаў, акардэаністаў, гітарыстаў ці цымбалістаў. Публіка энтузіястычна прымала выканаўцаў, узнагароджвала іх бурнымі апладысментамі, запрашала прыехаць чарговы раз.

У мерапрыемствах прыстунічалі госці з Беларусі, у тым ліку дыпламаты Генеральнага консульства РБ у Беластоку, і прадстаўнікі улад, уключна з міністрам замежных спраў Владзімежам Цімашэвічам.

Беларускае грамадска-культурнае таварыства мае вялікі вопыт у культурна-асветнай працы і паспяхова выконвае сваё прызванне служыць жыхарам вёсак і гарадоў. І таму БГКТ карыстаецца папулярнасцю ў народзе. Але дасягненні не даюцца так проста. Многа над гэтым папрацавалі старшыня ГП БГКТ Ян Сычэўскі і сакратар ГП Валянціна Ласкевіч, пераадольваючы шматлікія цяжкасці і перашкоды з боку тых, хто падстаўляе ім ногі. Арганізуюць яны мерапрыемствы на радасць аматараў беларускай культуры. Шырокай дарогі!

Віктар Бура

Фота ВІКТАРА БУРЫ

На фэсце ў Бандарах (злева): Ірына Матвяюк — загадчыца мясцовай бібліятэкі, Лявон Хлябіч — галоўны спецыяліст Семяноўскага вадасховішча, арганізатар фэсту і Вялянціна Ласкевіч — сакратар ГП БГКТ

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Да велікамучаніка Дзімітрыя маліліся вернікі з усёй Беласточчыны

Каля іконы велікамучаніка Дзімітрыя

У гэтым годзе ў час свята велікамучаніка Дзімітрыя Салунскага, якое адзначалася 8 лістапада, у Саках сабралася многа людзей. Прыехалі паломнікі з Беластока і навакольных мясцовасцей, многія прыхаджане прыйшлі пехатою. Вернікі прыкладаліся да цудадзейнай іконы велікамучаніка Дзімітрыя, якая толькі на час святкаванняў была вынесена з-за алтара на сярэдзіну царквы. Святую літургію ўзначаліў епіскап Бельскі Грыгорый у саслужэнні ігумена Германа з Супрасльскага манастыра, сакоўскіх іераманахаў і шматлікіх свяшчэннікаў з Беласточчыны.

Некаторыя дакраналіся да іконы велікамучаніка Дзімітрыя маленькімі іконкамі, якія пасля павезлі сваім сямейнікам. Епіскап Грыгорый у час пропаведзі звярнуў увагу на шматлікія выпадкі дапамогі пасля малітваў да велікамучаніка Дзімітрыя. Ігумен Варсанофій сказаў, што пасля малітваў перад Сакоўскай іконай велікамучаніка Дзімітрыя здарыліся апошнім часам аздараўленні ад хвароб галавы, нырак, лёгкіх, сэрца і пухліны. Гісторыю свайго аздараўлення расказаў сабраным настаяцель прыхода ў Ялоўцы а. Яўгеній Канаховіч. Сваё дзяцінства правёў ён у Кляшчэлях і ва ўзросце чатырох гадоў страціў зрок ад удару каня ў лоб. Пасля безвыніковага лячэння быў ён прывезены ў Сакоўскую царкву. Калі бацька непрытомнага хлопчыка прылажыў яго чалом да іконы, той адразу аздаравеў. Айцец Яўгеній Канаховіч гаварыў яшчэ аб справах блізкіх яго сэрцу — веры ў Хрыста і роднай мове, на якой звяртаўся да вернікаў.

— Многія з вас перасталі вучыць гаварыць на роднай мове сваіх дзяцей, а тым больш унукаў, — напамінаў а. Яўген паломнікаў, сярод якіх многа было беластачан. — Хочаце быць людзьмі культурнымі, а на культуру ўплывае родная мова і вера ў Хрыста. Нашая мова не простая ці крывая, а нармальная, не горшая за іншыя. Вучыце гаварыць на ёй сваіх дзяцей і прыводзьце іх у цэрквы.

У Мужчынскім манастыры святога велікамучаніка Дзімітрыя Салунскага, які існуе ў Саках ужо звыш года, пабольшала апошнім часам колькасць брацыі. Апрача ігумена Варсанофія і іераманаха Пятра, якія былі ад пачатку, жывуць у ім іерадыякан Тамаш і брат Марк. Зараз у былым школьным будынку вядуцца рамонтныя работы. Часова прыстасавалі гімнастычную залу для патрэб манастырскай часоўні, памянялі ў будынку 9 акон, перабудоўваюць ацяпленне і прыстасоўваюць школьныя залы для патрэб манастырскага жыцця. З трох залаў паўсталі келлі, а тры класы перабудоўваюцца на трапезную царкву. Да царкоўнай плошчы давялі водаправодную нітку і былі пастаўлены ў царкве вадасцёкавыя трубы. Прыхаджане не наракаюць, што з-за паломнікаў цесна ім маліцца ў царкве, дапамагаюць манахам. Выконваюць некаторыя будаўнічыя працы, прыбіраюць і прыносяць у манастыр сельскагаспадарчыя прадукты.

— Хочам выбудаваць манастырскі будынак на грэчаскі матыў на горцы, побач царквы. Калі будзе воля Гасподня, хацелі б мы паставіць у наступным годзе фундаменты і сцены. Мітрапаліт Сава абвясціў конкурс на выкананне праекта гэтага будынка. Некаторыя манахі жылі б у школьным будынку, які выкарыстоўваўся б на патрэбы паломнікаў, — заявіў настаяцель манастыра, ігумен Варсанофій.

Аляксей Мароз

У новай царкве

Урачыстае адкрыццё навучальнага года ў Іканапіснай школе ў Бельску-Падляшскім, якое адбылося 31 кастрычніка, спалучана было з асвячэннем пабудаванай пры школе Свята-Троіцкай царквы. Святкаванні пачаліся з Божай літургіі, якую ўзначаліў мітрапаліт Варшаўскі і ўсяе Польшчы Сава, і малітваў за вучняў. Пасля госці, сярод якіх быў бурмістр Бельска Андрэй Сцепанюк, пазнаёміліся з характарам установы і ўмовамі вучобы. Заняткі вядуцца ўжо ад пачатку кастрычніка, але мерапрыемства прымеркавана было да дня св. апостала Лукі, які лічыцца першым іканапісцам.

Будова царквы пачалася ў 2000 годзе паводле праекта Юрыя Усціновіча з Політэхнічнага інстытута ў Беластоку, які з'яўляецца адначасна выкладчыкам у Іканапіснай школе. Выпускнікі-іканапісцы і студэнты самі напісалі іконы да іканастаса і выканалі паліхромію на сценах. У царкве будуць маліцца студэнты і вернікі з Бельска. Кожны дзень у школе будзе пачынацца з ранняга багаслужэння, а некалькі разоў у тыдні будзе служыцца Літургія.

Іканапісная школа ўзнікла ў 1991 годзе пры прыходзе св. архістраціга Міхаіла. Вучацца ў ёй студэнты не толькі з Польшчы, але і з Беларусі, Расіі і ЗША. Выкладаюцца тут тэалагічныя прадметы, гісторыя Праваслаўнай царквы і пісанне ікон. Слухачы школы знаёмяцца з метадамі пазалочвання і рэстаўрацыі ікон. Вучоба іканапісання працягваецца чатыры гады. Выпускнікамі школы былі распісаны іканастасы ў цэрквах Супрасльскага манастыра, Гажова-Велькапольскага, у часоўнях у Орлі і Белавежы (у Доме сацыяльнай апекі).

Аляксей Мароз

У Ялоўцы, Пухлах і Саках

Трэба аб іх ведаць, варта іх бачыць, бо яны — помнікі нашага народа. На Беласточчыне знойдзем непаўторныя архітэктурныя помнікі праваслаўнага сакральнага будаўніцтва, а ў некаторых цэрквах — цудатворныя іконы, якія сілай сваёй святасці аздараўляюць людзей, дапамагаюць пазбавіцца ад хвароб і іншых бедаў.

Праваслаўнае брацтва пры царкве св. Мікалая ў Беластоку арганізоўвае пілігрымкі да такіх мясцовасцей. Варта імі карыстацца, бо такія паездкі вельмі карысныя ды недарагія і заўсёды арганізуюцца ў прыхадскія святы.

* * *

Пілігрымка ў Ялоўку адбылася на Уздзвіжанне Крыжа Гасподняга. Такога заступніка мае тамашняя царква. У 1944 годзе драўляная царква ў Ялоўцы згарэла. Новая, вельмі прыгожая, пабудавана пры народнай уладзе. Ужо многа гадоў настаяцелем яе з'яўляецца Яўгеній Канаховіч, які дбае, каб царква ў прыгранічнай мясцовасці была прыгожая звонку і ўсярэдзіне.

Асаблівую нязвыкласць прадстаўляе зімняя царкоўка. Над ёй тры прыгожыя купалы ўпрыгожваюць краявід.

Царква Уздзвіжання Крыжа Гасподняга ў сваё напрастольнае свята гасцявала ўладыку Іакава, епіскапа Беластоцка-Гданьскай епархіі. Уладыка ў саслужэнні святароў здзейсніў бажэственную літургію і пасвяціў парафіяльны дом.

* * *

На Пакрову пілігрымка накіравалася ў Пухлы, непадалёк Нарвы. Там знаходзіцца драўляная царква, архітэктурны помнік царкоўнага будаўніцтва. У ёй знаходзіцца цудатворная ікона Пакрова Божай Маці (на здымку). Да яе людзі моляцца і просяць дапамогі ў жыццёвых бедах.

Удастоіў святкаванне ў Пухлах епіскап Бельскі Грыгорый, якога вітаў настаяцель Павел Лапінскі. Па яго прапанове ганаровымі граматамі былі ўзнагароджаны стараста Мікалай Трафімюк і скарбнік Надзея Дулько.

* * *

Нядаўна пілігрымка царкоўнага брацтва пабывала ў Саках, што ў гміне Кляшчэлі ў магільнікавай царкве св. Дзімітрыя, якая з'яўляецца цяпер святыняй манаскага дома ў Саках. Здаўна адзначаюць там дзень св. Дзімітрыя, якога цудатворная ікона знаходзіцца ў царкве.

8 лістапада святкаванне ўдастоіў епіскап Бельскі Грыгорый. Разам з 12 святарамі здзейсніў ён святую літургію, выступіў з пропаведдзю аб неабходнасці добрых учынкаў.

У будучыні ў Саках будзе пабудаваны манастыр. У гэтым напрамку накіраваныя ўсе дзеянні царкоўных улад. Пасля заканчэння ўрачыстасці беластоцкая пілігрымка адправілася ў Бельск-Падляшскі наведаць Пасляліцэальную іканапісную школу.

Міхась Хмялеўскі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Царква спалучана са школьным будынкам

Ніхто, апроч Бога, не зможа сказаць жанчыне, ці будзе ў яе дзіця. Чалавек гэта спецыфічны від з абмежаванай плоднасцю. З пазааграніччным апладненнем змагаецца Каталіцкі касцёл. Тым часам першае польскае дзіця з прабіркі, дзяўчынка, канчае якраз 15 гадоў. У Беластоку, дзякуючы гэтаму метаду прыходзіць на свет у год 250 яе калег.

(Не)жаданыя дзеці

Аб лячэнні бясплоднасці шляхам пазааграніччнага апладнення, значыць, аб г.зв. дзецях з прабіркі, метадзе *in vitro* сталі гаварыць у спецыялістычнай прэсе ў канцы сямідзесятых. У Беластоку гэтым метадам амаль імгненна зацікавілася група лекараў з праф. Марыянам Шаматовічам. Сёння прафесар — міжнародная славутасць, кіраўнік Клінікі гінекалогіі і дырэктар Інстытута акушэрства і гінекалагічных хвароб Медыцынскай акадэміі ў Беластоку. Шаматовіч на практыцы сутыкнуўся з гэтым метадам толькі ў 1983 годзе ў Швецыі. У Гётэбаргу дзейнічаў адзін з першых у свеце такіх цэнтраў.

— Я там пабачыў, як выконваюцца такія працэдуры ў натуры, паколькі апісання было замала. Зараз пасля вяртання разам з цэлым беластоцкім калектывам сталі мы дабівацца да розных дзвярэй, — адказвае з-за партатыўнага камп'ютэра самавіты, асыпаны ўжо сівізною прафесар.

Беластоцкія лекары стукалі чатыры гады; збіралі абсталяванне. 12 лістапада 1987 г. нарадзілася першае ў Польшчы дзіця, як хутка назвалі яго журналісты — з прабіркі.

— Ягоная маці лячылася ў нас раней. Былі ў яе пашкоджаныя яйцаводы. Без магчымасці пазааранічнага апладнення не мела яна шанцаў мець патомка. Раней мы рэканструявалі яйцаводы, ды без поспеху. Вядала, што пазааранічнае апладненне ў Польшчы гэта піянерская справа. Рызыкнула. І ўдалося! На пачатку ўдавалася нам такая цяжарнасць зрэдку. Сёння мы стаім на еўрапейскім узроўні. У год у Беластоку нараджаецца такім чынам 250 дзетак.

Першай дзяўчынцы з прабіркі зрабілі тады шмат здымкаў. Сёння ў архівах газет, якія пісалі пра справу, не знайсці тых фатаграфій. Маці дзяўчынкі паявілася ў клініцы праф. Шаматовіча, калі дзяўчынка пайшла ў школу. Пасля замоўкла. Жыве з дачкой у адной з падляшскіх мясцовасцей, не хоча сустрэч з журналістамі, здымкаў, папулярнасці.

— Большасць параў, пасля паспяховага лячэння, значыць, нараджэння дзіцяці, парывае кантакт з клінікай. Асабліва ў Польшчы бацькі скрываюць факт такога віду зачацця не толькі перад сям'ёй, знаёмымі ды суседзямі, ды часта і перад дзіцём, — сцвярджае прафесар. — Сем'і, у якіх пасля катаргі лячэння і беспаспяховых працэдур, народзіцца нашчадак, вельмі шчаслівыя. І не хочуць, каб штосьці гэта папсавала.

Малыя эскімосы

Аўстралійцы правялі апытанне сярод сем'яў, якія рашыліся на ўсынаўленне і сярод тых, хто рашыўся на пазааранічнае апладненне. Атрымалася, што значна больш шчаслівыя сем'і з „дзецьмі з прабіркі".

Па Польшчы вандруе анекдот, у якім дзеці народжаныя ў выніку пазааранічнага апладнення называюць эскімосамі. Прыйшлі на свет з замарожаных эмбрыёнаў, якія месяцамі ляжалі ў вадкім азоце.

— А што будзе, як нараджу негра? — пыталася ў лекараў адна маладая жанчына.

— Гэта немагчыма, — супакойвае прафесар Шаматовіч. — У нармальных умовах, складзены ў час палавога акту сперматазоід мусіць правандраваць цераз канал матачнай шыйкі, цераз усю поласць маткі, паддаючыся розным зменам. Трапляе ў яйцавод. Так гэта выглядае з боку вонкавага свету. А з боку поласці жывата, у другі канец яйцавода ўпадае яйцавая клетка, адпаведна падрыхтаваная, даспелая ў яйцаводзе. У яйцаводзе наступае сустрэча дзвюх гамет. У яе выніку даходзіць да апладнення. Узнікае зачатак. Вандруе ён у поласць маткі, загнеждваецца ў слізістай абалонцы маткі і такі, вось, пачатак цяжарнасці.

Негр мусіў бы ўключыцца ў такія суадносіны як нейкі там троечны.

Прафесар дадае:

— У пазааранічным апладненні яйцавая клетка, замест у яйцавод, пасля ўколу трапляе ў пасудзінку з ападведнай вадкасцю, нават не ў прабірку, выдуманую журналістамі. Сперматазоіды дадаюцца ў тую пасудзінку. Там наступае сустрэча і гэта, вось, пазааранічнае апладненне. Калі ўзнікае зачатак (зародак), пераносяць яго ў нутро маткі і цяжарнасць развіваецца.

Найбольшы зафіксаваны паказальнік плоднасці (лік сто параў, на адзін цыкл) гэта 34 цяжарнасці. У нашай цывілізацыйнай сферы вагаецца ён на ўзроўні ледзь 20 цяжарнасцей. Пасля 35 гадоў у жанчыны ён рэзка паніжаецца; недзе 5-10 прац. жанчын захоўвае здольнасць да размнажэння. У каля 65% гамет трапляюцца генетычныя дэфекты. Загнеждваецца ледзь 25-30 прац. эмбрыёнаў. Рэшта ідзе на страту.

— Жанчына гэта спецыфічная істота, бо не дэманструе свае цечкі, як іншыя млекакормячыя. Ну і пасля родаў не пазнае свайго дзіцяці, хіба што будзе яно іншай расы, хоць бы негр у белай жанчыны. Прыме кожнае.

Толькі касцёл супраць

— Ад нікога я не адчуваў варожасці да мае медычнае практыкі, як толькі ад святароў Каталіцкага касцёла. Хоць са шмат якімі нармальна кантактуюся.

Папярэдні беластоцкі мітрапаліт абп Станіслаў Шымэцкі на від прафесара Шаматовіча адварочваўся задам. Сённяшні — Войцех Земба — нават усміхаецца ды паціскае руку. У апошні час прафесара запрасілі на семінар праводжаны біскупам дапаможным (pomocniczy) беластоцкай архідыяцэзіі Эдвардам Азароўскім. Дайшло да спрэчкі. Ксёндз прафесар Юзаф Забельскі, рэктар Архідыяцэзіяльнай вышэйшай духоўнай семінарыі з хваляваннем пытаўся:

— Ці хацелі б вы мець дзіця коштам забіцця некалькіх іншых?

— Гэта было сцвярджэнне вельмі не да месца, — адбіваў атаку праф. Шаматовіч. — Зародкі таксама гінуць у працэсе пазааранічнага апладнення, як і ў натуры.

Аднак да кансенсусу паміж лекарам і духоўнымі не дайшло. Рыма-каталіцкі касцёл — адзіны, які не дае згоды на пазааранічнае апладненне. Гэтыя метады адабраюць Маісеева веравызнанне, будызм, праваслаўе, пратэстантызм, а нават і іслам.

Каталіцкія іерархі спасылаюцца на тры дактрынальныя прычыны. Згодна з першай семя можа быць складзена выключна ў похве ў час палавога акту паміж сужонствам, а семя для пазааранічнага апладнення збіраецца з мастурбацыі. Згодна з другой — у час гэтага працэсу гінуць зародкі. І ўрэшце, зачацце ў выніку пазааранічнага апладнення не з'яўляецца актам любові, а тэхнічным. Праф. Шаматовіч:

— Шмат дзяцей нараджаецца без любові, калі да цяжарнасці даходзіць, скажам, у выніку згвалтавання. Жанчыны, якія прыходзяць на лячэнне, пераважна каталічкі. У час споведзі не маюць праблем, даецца ім адпушчэнне грахоў.

Да прафесара дайшлі чуткі, што шпітальны капелан абмінае палаты ягонай клінікі, дзе ляжаць жанчыны пасля пазааранічнага апладнення. Правёў з духоўным цвёрдую размову. Капелан стаў паяўляцца і тут.

— Я сам ахрышчаны. Паходжу з каталіцкай сям'і, — прызнаецца прафесар. — Але стаў я агностыкам, пра што ўсе ведаюць, ад біскупа ўніз.

Мае 36-гадовага сына, таксама лекара; працуе ён у клініцы, якой кіруе бацька.

Гэта не медычныя працэдуры?

Апошнія гады не былі лёгкімі для клінікі праф. Шаматовіча. Дактрынальны супраціў Касцёла пераклаўся на г.зв. грамадска-палітычныя рашэнні, а непасрэдна на грошы. Тэхнікі размнажэння, успамаганыя тэхнічна, не рэфундуюцца.

— Папярэдні ўрад меў поўны рот пустых фразаў аб прасямейнай палітыцы, — наракае прафесар. — Да межаў прыстойнасці ўзлаваў мяне ліст, які атрымаў я ад міністра здароўя, а пад якім у дадатку падпісаўся краёвы кансультант па справах акушэрства і гінекалогіі. Заяўлена ў ім, што тэхнікі размнажэння ўспамаганыя медычна гэта не медычныя працэдуры. Дык якія ж яны? Д'ябальскія?

І ні на што не здаўся аргумент, што Сусветная арганізацыя здароўя (WHO) лічыць бясплоднасць грамадскай хваробай.

— Жанчына і мужчына гэта толькі пара. Толькі калі народзіцца дзіця, можам гаварыць пра сям'ю. Каб мець дзіця, багаты чалавек можа выкарыстаць усе шанцы. А што мае зрабіць бедны, у якога такія самыя чалавечыя прагі?

За пазааранічнае апладненне трэба заплаціць немалыя грошы. У беластоцкім асяродку ў цану ўваходзіць стандартнае пазааранічнае апладненне — 1 800 зл., а пры ўліванні сперматазоідаў у яечную клетку — 2 500 зл. На лякарствы, у залежнасці ад узросту і ўражлівасці яйцаводаў, трэба выкласці ад 1 500 да 2 500 зл. і больш. Рэшта коштаў гэта падарожжа, кватэра ці гасцініца на некалькі дзён, харчаванне, фінансавыя вынікі адсутнасці на працы. Так вось, перакладваючы на грошы, сям'я, якая рашыцца на дзіця такім метадам, павінна „інвеставаць" да 10 тысяч злотых.

Два гады таму праф. Шаматовіч арганізаваў у варшаўскім Еўрапейскім гатэлі сустрэчу, прысвечаную апладненню *in vitro*. Паявіліся на ім цяперашні шэф МЗС, а былы прэм'ер Уладзімеж Цімашэвіч і сённяшні віцэ-прэм'ер Марэк Поль. Прыехалі спецыялісты з Венгрыі, Чэхіі, Італіі і Ізраіля.

— Аказалася, што ў Ізраілі рэфундуюцца лячэбныя цыклы, пакуль пара народзіць двое дзяцей, — успамінае прафесар. — Нават калі без поспеху лечаць бацькоў 10 ці 15 гадоў. Тое ж у Італіі, каталіцкай краіне. Раз — вяртанне коштаў лякарстваў, у іншы раз — коштаў працэдуры. На ўсім свеце ставіцца пытанне: як павысіць эфектыўнасць такіх метадаў, а толькі ў Польшчы — як іх ліквідаваць. Пан Марэк Поль абяцаў памагчы. Разлічваю на яго.

Запаўняйце зямлю

Паводле Дэкларацыі правоў чалавека, мужчына і жанчына ў спелым узросце, без ніякіх расавых, нацыянальных і рэлігійных абмежаванняў маюць права на сужонства і заснаванне сям'і. Сям'я гэта натуральная і фундаментальная грамадская адзінка. Лекары, навукоўцы, настаўнікі, лідэры пры фармаванні грамадскай думкі мусяць змагацца за асвету палітыкаў і грамадства, што права на патомства — асноўнае права чалавека.

З доследаў праф. Шаматовіча вынікае, што бясплоднасць прызнана Сусветнай арганізацыяй здароўя як грамадская хвароба. Яе лячэнне ў Нямеччыне і ЗША займае 0,1-0,3 прац. коштаў прызначаных на ахову здароўя. У ЗША гэта 1,7 долара на сям'ю ў месяц. Польская дзяржава дапамагае ў вылечванні хвароб, якія вынікам алкагалізму, курэння тытуню і наркаманіі. Не вяртае за лячэнне бясплоднасці метадам пазааранічнага апладнення. У Польчшы не вядуцца статыстыкі нарадзін і вынікаў нарадзін метадам *in vitro*.

Згодна з данымі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, кожны дзень у свеце здзяйсняюцца да 100 мільёнаў палавых зносін, штодзень гэта 1 мільён цяжарнасцей. З мільёна цяжарнасцей 500 тысяч — непланаваныя. З мільёна цяжарнасцей у дзень 250 тысяч — нежаданыя. З 250 тыс. у дзень 150 тысяч — неданосы, з чаго 50 тыс. — нелегальныя аборты, у выніку якіх штодзень умірае 500 жанчын.

Мацей Халадоўскі

Фільмавы вечар

Пахмурнае неба, холад і сумныя думкі: Што рабіць вечарам? Настрой можа паправіць візіт у кінатэатр. У гэтым тыдні прапаную тры фільмы.

„Пракляты шлях" (*Road to Perdition*) Сэма Мендэса спадабаецца аматарам гангстэрскіх фільмаў. Галоўны герой — Майкл Саліван, прафесійны забойца, разам з сынам уцякае ад мафійнага прыгавору. Саліван — суровы, веруючы і прынцыповы каталік. Забіваючы па загадзе мафіі, сплачвае доўг: працуе для мафіёзнага лідэра, якому абавязаны ва ўсім. Жыццё героя змяняецца, калі яго старэйшы сын становіцца сведкам забойства. Мафія выдае прыгавор на Салівана. Гіне яго жонка і малодшы сын — а ў галаве героя ўзнікае адна думка: ратаваць сына, не толькі ад смерці, але і ад падобнага лёсу.

Падарожжа становіцца пеклам. За ўцекачамі едзе забойца — фатограф, які свае ахвяры ўвекавечвае на негатывах.

На экране пабачым Тома Генкса, Пола Ньюмена, Джуды Лоў, Данела Крэйга.

Цудоўная музыка Томаса Ньюмена аддае драматызм сітуацыі, атмасферу страху і гневу. Рэжысёр прымушае нас задумацца над жыццём, паказвае, што нават д'ябал можа чакаць збаўлення.

„Хэлоўін: Уваскрэсенне" (*Halloween: Resurrection*) у рэжысуры Рыка Розентала гэта прапанова моладзі, якая патрабуе адрэналіну ад страху, выкліканага забойствамі страшэннага Меерса, славутага злачынцы 70-х гадоў.

У час Хэлоўін — амерыканскага свята духаў, група моладзі трапляе ў стары дом, дзе калісьці Меерс учыняў забойствы. Пачаткова ўсё выглядае нармальна, але калі гінуць усё новыя асобы, узнікае падазрэнне, што ў хаце знаходзіцца забойца!

Джэмі Лі Кертыс, Б'янка Кажліч — якія выступаюць у галоўных ролях, пераканаўча аддаюць атмасферу страху і містыкі, якая ў не аднаго гледача выкліча дрыжыкі!

На канец штосьці для наймалодшых, хаця і старэйшыя аматары кіно часта аглядаюць казкі пад назвай „Жамчужыны дракона" (*Dragon Ball Z*). Абаронцы Зямлі, мацнейшыя ваяры, змагаюцца за шчасце жыхароў нашай планеты, прысвячаюць ёй не толькі сваё добрае імя, але і жыццё, бо ворагі Зямлі валодаюць небяспечнай машынай, якая пасля выбуху выпускае з сябе Зло ўсяго свету. Ці ваяры перамогуць ворагаў? Пабачце самі!

Паўліна Шафран

Чаму ў Арлянскай гміне мала лясоў

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Арлянская гміна — у параўнанні з суседнімі — слаба аблесена. Нямногія яе жыхары зацікаўлены аблясеннем угоддзяў, балазе ў абставінах, калі штораз больш зямлі запускаецца. Чаму так дзеецца?

Паводле актуальных даных староства, у Арлянскай гміне налічваецца 12 801 гектар сельскагаспадарчых угоддзяў, з чаго 1 864 гектары знаходзіцца пад лясамі. Лясы тут займаюць каля 12% абшару і гэты паказальнік утрая меншы ад ваяводскага (30%). Дзяржаўных лясоў у гміне 52,3%. Усе лясы маюць гаспадарчы характар і з іх здабываецца драўніну для розных мэтаў; у 2000 годзе з недзяржаўных лясоў прыдбана 701 куб таўшчыні.

У гміне выступаюць лясы, бары і алёсы на падмоклых грунтах. Пераважаюць хвойныя дрэвы, асабліва сасна. Узрост лесу вар'іруецца, але найбольш маладняку. Вялікія суцэльныя лясныя масівы на тэрыторыі Арлянскай гміны не выступаюць; найбольшыя лясныя комплексы распаложаны каля вёсак Шчыты-Навадворы, Рудуты, Маліннікі, Рыгораўцы, Вулька-Выганоўская. Лясы гэтыя захаваліся ў падмоклых нізоўях рэк або на малаўраджайных глебах. Невялікае аблясенне гміннай тэрыторыі спароджана наяўнасцю тут вялікіх абшараў ураджайных зямель; пад 70% ворных угоддзяў складаюць глебы III і IV класаў, для зялёных угоддзяў гэты паказальнік роўны 60%.

У гэтым годзе, да кастрычніка, у Арлянскай гміне толькі дзесяць асоб у розным узросце падалі ў Гмінную ўправу заяўкі на прызначэнне палеткаў пад аблясенне (паводле старых правіл — без кампенсацыі). Паверхня ўсіх палеткаў — ад 0,35 да 1,95 га — налічвае 10,53 га.

* * *

Вучоныя падлічылі, што калі б чалавечая рука не кранала зямлі, дык за трыста гадоў уся зямля зарасла б лесам. Прыкладам гэтага можа быць перыяд бежанства, калі пакінутая зямля праз некалькі гадоў стала зарастаць самасеем.

Міхал Мінцэвіч

Паляк умее

Мо гэта і праўда, бо — падумаць — пагранзаставу ў Дубічах-Царкоўных пабудавалі хутка і шыкарна. Сёння абы грошы і спонсары, а справа пойдзе ў рух, бо будаўнічых матэрыялаў — хоць адбаўляй. Гэта не тое, што пры камуне, калі ўсялякую цэглу, цэмент ці іншыя „стратэгічныя" матэрыялы надзялялі і не ўсё было даступна простым людзям.

Пагранзаставу аддалі ў карыстанне 11 кастрычніка г.г.; ходу падзей не буду апісваць, бо тады я развозіў пошту, а пра гэта была перадача ў тэлебачанні і артыкул у „Ніве". Я толькі падвечар бачыў, як адлятаў ад нас у Варшаву верталёт з „шыхамі".

Застава знаходзіцца амаль побач майго панадворка, за клуняй, дзе ўлетку мясцовыя п'яніцы мелі сваё прыстанішча і платы ламалі як хацелі. Цяпер ім гэта абарвецца, бо будуць баяцца вычвараць свае дзікія оргіі і хамства, бо побач ваенны аб'ект; і гэта вельмі добра.

Застава пабудавана на пяцёрку, а нават шасцёрку! Абгароджаныя прыгожым плотам будынкі з прыгожай цэглы, сіметрычныя і акуратныя, да іх вымашчаны асфальт з кафелькамі. Навокал парадак і чысціня, што не апісаць. І цешыцца сэрца, што пагранічнікі з нашага народа, хаця мо і не ўсе. У заставу на працу прыняты некалькі чалавек з нашага наваколля — а гэта сёння шчасце як у латарэі — і хай працуюць на здароўе! У асобным жыллёвым будынку будзе пражываць восем сем'яў, а выгады там такія, якіх хіба нават апошні рускі цар Мікалай II не меў у сваім палацы, што быў у Белавежы; слава Дубіч-Царкоўных ад гэтага яшчэ вышэй паднімецца.

Варта адзначыць, што ні немцы, ні амерыканцы лепш будаваць не ўмеюць, як палякі пабудавалі ў нас пагранзаставу. І нездарма, — кажуць — што немцы нашы камбайны „Бізон" купляюць направал; вядома — новыя з самай фабрыкі.

Мікалай Панфілюк

Вер – не вер

Добры дзень, Астроне! Чытаць дык я па-беларуску чытаю, але з пісаннем у мяне горш. Таму менавіта я вырашыў напісаць у тваю рубрыку „Вер — не вер..." па-польску, спадзеючыся, што ты перакладзеш на беларускую мову.

Прысніўся мне, Астроне, дзіўны сон. Быццам я еду самаходам па вуліцы ў Беластоку, у ваколіцах парку. Бачу, перада мной едзе паліцэйскі самаход, які цягне за сабою прычэп на двух колах. Самаход паварочвае налева, а я ўязджаю на тую вуліцу за ім.

Не памятаю, ці мяне паліцыя затрымала, ці я затрымаўся сам. Мы стаялі за іхным самаходам, размаўлялі пра хуліганства і яшчэ пра нешта. Пасля гэтай гутаркі я прайшоў наперад і стаў спераду іх самаходу, бо быццам бы там я пакінуў свой матацыкл. Стала ўжо цёмна, ноч. Па вуліцы ходзяць маладыя мужчыны. Я бачу, што няма майго матацыкла. Яго ўкралі зладзеі. Я падбягаю да паліцыянтаў і крычу: „Як жа ж гэта можа быць, каб каля іх самаходу ўкралі мой матацыкл, а да ўсяго гэтага яшчэ ж два тыдні таму ўкралі ў мяне самаход!" У сапраўднасці я маю гэты самаход. І ў той жа момант я прачнуўся, поўны злосці і абурэння.

Скажы мне, Астроне, што можа абазначаць гэты сон?

Слаўка

Слаўка! На жаль, калі сніцца паліцыя, дык могуць быць непрыемнасці, крыўда, ды незалежна ад таго аб чым вы размаўляллі. Другая справа: калі б табе прыснілася, што ты гэты матацыкл згубіў, дык тады можна было б спадзявацца выгаднай знаходкі. Але ты быў цвёрда перакананы, што тут пабывалі зладзеі, якія ўкралі не толькі твой матацыкл, пакінуты табою каля паліцэйскага самаходу, але і (на два тыдні раней) твой самаход.

Зладзеі ў сне абазначаюць небяспеку, страту, варожасць. Пільнуй самаход!

Астрон

Няўдачлівы тэлефон-аўтамат

Няўдачлівы тэлефон-аўтамат стаіць ля скрыжавання дарог з Нараўкі ў Бандары і ў Семяноўку ды з Нараўкі ў Міхалова цераз Сушчу ў Новым Ляўкове (Нараўчанская гміна, Гайнаўскі павет). Праўда, яго часта рамантуюць, але ад пару месяцаў беспаспяхова. Псуецца ён і псуецца. У кастрычніку не спяшаліся з рамонтам, бывала, і пяць дзён. Пазвоніш пад бясплатны нумар тэлефона 980, там запішуць, а ехаць не едуць. А тэлефон-аўтамат у Новым Ляўкове вялікі свавольнік. Часта так бывае, што адразу выкідае тэлефонную картачку. Націснеш „4" і ён пакажа... „6", а ўжо „8" зусім не ўдаецца набраць.

Работнікі сувязі тлумачаць: „дрэнна працуе г.зв. чытнік" або „на электроннае абсталяванне дрэнна ўплывае сырасць, а цяпер, вядома, на двары вільготнае асенняе паветра".

Але чаму тады беззаганна працуюць тэлефоны-аўтаматы ў Нараўцы, Плянце, Семяноўцы, Тарнопалі і ў Старым Ляўкове? Ім нішто не перашкаджае.

(яц)

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://republika.pl/niva_bielastok/*
E-mail: *niva_bielastok@poczta.onet.pl* альбо: *niva_bielastok@skrzynka.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2003 r. upływa 5 grudnia 2002 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Будзе аранжарэя

„Даўціпы" *Андрэя Гаўрылюка*

Ксёндз прыходзіць у дом новага парафіяніна:

— Колькі ў вас дзяцей?

— Двое: дачка і сынок.

— Ці не сорам вам: мужчына як дуб і толькі двое дзяцей!

— Гэта не так, я жанаты ўсяго два тыдні.

* * *

Маці гатовіць на кухні куццю, калі з пакоя раздаецца крык сынка:

— Мамачка, ёлачка гарыць!

— Колькі разоў табе паўтараць, што не гарыць, толькі свеціцца?!

Праз хвіліну:

— Мамачка, фіранкі свецяцца!

* * *

Грыша вярнуўся з экскурсіі ў Парыж і расказвае сябрам:

— Як там казачна, вы нават не ўяўляеце! Быў я ў адной установе на плошчы Пігаль. Хапіла толькі націснуць кнопку і ў тую ж хвіліну выходзяць з сауны тры прыгожыя кабеткі, цалкам голыя, ды пачынаюць лашчыцца і цалаваць...

— То ці ты, дурню, не мог і нам прывезці тую кнопку?!

* * *

Гутараць два сябры:

— Сёння прысніўся мне страшны сон. Снілася мне, што мая жонка пабілася з прыгожай маладой мільянеркай за мяне...

— І гэта мае быць страшны сон?

— Так, бо мая жонка перамагла.

* * *

Муж да жонкі:

— Што гэта мае значыць: я выпадкова знайшоў у тваёй сумцы ліст з матрыманіяльнага бюро, у якім паведамляецца, што маюць адказ на тваю прапанову?

— Не хвалюйся: гэта даўніна.

— Якая даўніна? Там ёсць свежанькая дата: месяц назад...

— Ах, праўда! Ты тады акурат прыхварэў...

Двухлітарная крыжаванка



Гарызантальна: 1. рыба сямейства трасковых, 3. прыхільнік расізму, 5. сярэдневяковая залежнасць пазычальніка ад пазыкадаўца, 7. „мудрая" начная птушка, 9. напр. Нёман, 10. вялікае афрыканскае возера, 11. пастухова прылада, 12. карцёжная фігура, 14. напр. псеўданім, 16. прозвішча прэзідэнта ЗША ў 1969-74 гг., 17. пояс неба, па якім Сонца праходзіць свой гадавы шлях.

Вертыкальна: 1. травяністая меданосная расліна з жоўтымі кветкамі, 2. Поль, канадскі спявак, 3. тоўсты сук, 4. сума грошай, якую ігрок ставіць на карту, 6. аўтар „Зоркі Венеры", 8. шумны натоўп, зборышча, 9. камунікацыя ўздоўж лініі фронту, 11. кампазітар оперы „Мадам Батэрфляй", 13. грыб з жоўта-карычневай слізістай шапкай, 14. кельцкая радавая абшчына, 15. самка казла.

(Ш)

Рашэнне крыжаванкі складуць літары з пазначаных курсівам палёў. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку з 40 нумара

Гарызантальна: агат, смерч, ахапак, гной, сцэна, гаалян, „Спітфайр", сечка, „Калевала", Панфілаў, Эберт, тэкстура, Гевара, цяжар, трыо, Гавана, Адана, Рыца.

Вертыкальна: смецце, Бранск, генетыка, тайга, пажар, паляк, Апалінэр, Айзенэрц, сапа, Чына, Кале, пакт, аўстрыец, Баярда, ржанне, невад, танаж, катар.

Рашэнне: **Хто жыве надзеяй, не нажывецца**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

Ад каго грэх на зямлі

Мой дзед Іван лічыў заўсёды, што ўва ўсім ліхім вінаваты на Зямлі, і, мабыць, у космасе, бабы. Значыць, першая з іх — Ева. І хоць Пан Бог сам яе асабіста, уласнаручна, на сваё падабенства, кланіраваў з Адамавага рабра (Адама таксама стварыў не кажучы „хай будзе чалавек", а зляпіў яго з таго, што меў пад рукою — з чырвонае, глейкае, урадлівае эдэмскае зямлі, і толькі духа дыхнуў яму ў ноздры, перад тым, як усыпіць на нейкі момант перад аперацыяй стварэння свайго апошняга, значыць, найлепшага зямнога твора). Ну, і хоць я дзедаіванаў неадродны патомак (сам ён мне выдумаў імя Вандал, а Ванькам з чуласцю называў), лічу, усё ж, што Ева, хоць першая з'ела славуты плод (зусім не лепшы ці прыгажэйшы за іншыя фрукты ў райскім садзе), не толькі яна вінавата ўва ўсім не тым што трэба. А былі б мы (гэтыя ўсе мільярды ейных патомкаў!) у эдэмскім садзе, які разросся б на ўсю зямлю, такія шчаслівыя!..

— Каб не паслухаў сваю жонку дурны Адам! — сказаў я ўголас, зусім забыўшыся, што Агата якраз у кухні робіць салат, мой улюбёны — пад маянэзам, з нашынкаванай гароднінай... Дзе агурочак, бульба, фасолька, морквачка...

— Ты чаго?! — здаецца, не цалкам усё зразумела мая жонка, пагрозліва ўзмахнуўшы тлустым нажом.

— Ты чаго нажом махаеш? — я з табурэткай адсунуўся далей ад мае ўзброенай паловы.

— Жэрці табе раблю, мой ты міленькі. А ты, зноў, бачу, разважаеш пра тое, хто прычына граху і бедаў у свеце! Смешны ты, Вандал! Узяўся б за парадкі ў сваім пісьмовым стале, пашукаў бы, куды дзеўся рахунак за электраэнергію. Смешны! У прыцемках будзеш сядзець, як нам адключаць *прунд*! Склеротык! Смешны!

— Ты кінь, Агатка, эпітэтамі ў мяне цаляць! І так мы, мужчыны, слабы пол у сапраўднасці. Больш нас памірае яшчэ да сваіх родаў, у маленстве, у рызыканцкую дарослась...

— Курыце, п'яце!.. — пачала свой заўсёдны пералік мая Агата. — Па бабах, гэтае самае, бегаеце...

— Ты гэтак да мяне?! — вырачыўся я на маю каханую жоначку, налітую ўжо чырванню па карэньчыкі валасоў.

— А што?! Ты таксама, было ні было — мужык.

— І маю адказваць за ўсе нашы грахі.

— Куды з рукамі?! Горш малога! Не чапай салату! Рукі памыў?!

І мацярынскім жэстам, запамятаным мною навекі ад мае мамы Тэклі, сцебанула мяне анучай па патыліцы. Па патыліцы, бо я ўжо ўцякаў, як калісь, у сенцы. Ай, у нас сенцаў у блёку няма! На балкон дзыганула за мною і Агата. З анучкай.

Тут я адчуў прыліў свае мужчынскае сілы, якую так душаць у нас жанчыны. Хочуць у нас бачыць хлапчукоў, якіх, вось, анучкай трэ сцябаць, каб у шкоду не ўлазілі. Вядома, за анучку бяруцца, калі ўжо павешаны ў шафе вэлюм...

— Тут табе не тут! — не вельмі граматычна выказаўся я, захліснуўшыся марозным ветрыкам. Анучкай перахапіў Агаціны далоні і звычайна, па-хамску, спутаў сваю кабету.

— Што табе не тут?..

Хацела штосьці яшчэ дадаць мая Агата, ды не змагла. Зрабіў я тое, што Адам, каб Ева перастала балбатаць. Зачыніў яе вусны сваімі.

— О, Арлянскія зноў дурэюць, — пачуў адным вухам з суседняга балкона.

Вандал Арлянскі

Наша нашасць

— Сссзьссы... — пачаў мядзведзь Сандар Жоржавіч чарговы сход уселяснога кіраўніцтва. Кіраўніцтва, прыселае ў аснежаным імху, здурнела.

— Што ён мае на ўвеце? — знеспакоілася вавёрка Кацюша, захіляючыся ад марозу кітай.

— Гм-гм, — задумаўся дзяцел Стукач, самы блізкі супрацоўнік Жоржавіча.

Мядзведзь пачуў ягонае гмыканне.

— Не „гм-гм", а „ссызьзьссы"! — адрэзаў. — Сссзьзьсспара, на зьзьбліжэньне з ссзьзьнародам. Сссзьзьвоўк ссзьзь... Нятупін з ссзьзьуладзіміраўскага сссзьзьлесу ссзьзьмусіць сссжсьсьведаць, што мы сссзьзьссамі ссзьзьмаем ня толькі сссзьзьгордасьць ды ссзьзьгонар, але і сссзьзьссмову. Ссзьзьсссбудзем сссзьзьсссусе адсьсьюль ссзьзьзьгаварыць на сссзьзьзьнашай сссзьзьзьроднай мове.

Заяц Генік затрапятаў ад страху вушамі:

— А я не ўмею. Значыць, разумею, ды гаварыць — ужо ж не. Злітуйцеся!

— Дык я скажу, заяц, на вашай мове, — нервова скрыгітнуў зубамі мядзведзь. — Справа ў тым, каб даказаць нашу нашасьць. Нашасьць ня ёсьць уласнасьцю якойсь там зьмяі Ссапіі ці вужа Зьзянона, ці, не дай Бог, Нятупіна, воўчае яго племя! Нашасьць ёсьць нашасьць, а не іхнасьць. Сссзьзьсссразумееце.

— Ну. Хіба, разумееце, значыць, разумею.

— Ну, дык добра. Цяпер, сссзьзьзьсьсьсьвяртаецеся да сябе ды сссзьзьперастройвайцеся.

Уселясное кіраўніцтва паклала вушы на спіны, а ілбы апусціла ўніз. Лань Гаўрусіха, якая заўсёды ўзорна выпаўняла мядзведжыя загады і пільна выконвала ягоныя распараджэнні, ужо па дарозе на паляну спрабавала практыкавацца:

— Сссзьзьзьссс, сссзьзьзьссс...

Ад гэтых паўтораў пачаліся ёй путацца путавыя косткі і што і раз купсьтыкалася ў снег. Урэшце, калі ўжо спачывала ў сваёй катлавінцы, успомніла сваё маленства і бабулю, якая спявала ёй калыханку:

— Сьпі, ланюшка, сьсьсьпі... Сьнежна-бел-чырвона-сьнежа-бела-сьсьпі...

Гэтыя колеры ўзніклі перад напаўзаплюшчанымі ланнімі вачыма.

— Гэта, мабыць, ад гэтага сьнегу ды сонейка на зыходзе, — уздыхнула Гаўрусіха настальгічна. — Ды ж адкуль у мяне тая настальгія?..

Тым часам новая ідэя Сандара Жоржавіча маланкава даляцела на ўскраіну лесу, да змяі Ссапіі ды вужа Зьзянона. А тыя давай галовы ламаць над тым, што мае на ўвеце мядзведзь.

— Да халеры, сссзьзьзьссс, чаму ён, сссзьзьзьссс, яшчэ не засснуў зьзімовым сном?

МакХолад

ISSN 0546-1960